153. МОСКВА 19.
УЛ. ФРУНЗЕ 10 ИНСТИТУТ
СОВ. СТРОИТЕЛЬСТВА
И ПРАВА

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 126 (5488)
АЎТОРАК
2
ЧЭРВЕНЯ
1936 г.
Год выдання XIX

ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

АБ ХОДЗЕ ЎЗДЫМУ ПАПАРАЎ У БССР — ПАСТАНОВА БЮРО ЦК КП(б)Б.

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — СОВЕЦКІЯ ЛЁТЧЫКІ. І. ШЛЯФЕР — У ЧЭРВЕНІ НЕ РЫХТУЮЦЦА ДА ЎБОРКІ. І. ТУРЭЦКІ — АБ ДЗІЦЯЧЫМ АСАРТЫМЕНЦЕ. ІНЖ. **МАКАЦЭВІЧ І ЭПШТЭЙН** — НАШ ПЕРШЫ ВОПЫТ.

АГЛЯД ПРУКУ — ПРАЙШЛО БОЛЬШ ТРОХ МЕСЯЦАЎ...

ГОРДЫЯ СОКАЛЫ НАШАЙ РАДЗІМЫ.

АБМЕРКАВАННЕ ПРАЕКТУ ПАСТАНОВЫ ЦВК І СНК САЮЗА ССР.

ТРЫ ГАДЫ ЧЭЛЯБІНСКАГА ТРАКТАРНАГА ЗАВОДА.

ЗА РУБЯЖОМ: ПЕРАМОГА БАСТУЮЧЫХ МЕТАЛІСТАЎ ФРАНЦЫІ. НОВАЯ ПРАВАКАЦЫЯ Ў ПАЎНОЧНЫМ КІТАІ. ПЕРАД СТВАРЭННЕМ НОВАГА ФРАНЦУЗСКАГА ЎРАДА.

СОВЕЦКІЯ ЛЕТЧЫКІ

За выдатныя асабістыя поспехі па аўладанню баявой авіяцыйнай тэхнікай і ўмелае кіраўніцтва баявой і палітычнай падрыхтоўкай ваенна-паветраных сіл рабоча-сялянскай Чырвонай арміі ЦВК СССР узнагарадзіў ордэнамі Саюза 560 лётчыкаў РСЧА.

Узнагароджанне ордэнамі лепшых людзей авіяцыі з'яўляецца найярчэйшым пацвярджэннем магутнага росту кадраў совецкіх лётчыкаў, якія дасканала авалодваюць складанай авіяцыйнай тэхнікай.

Толькі ў краіне перамогшага пролетарыята, у краіне, дзе кожны працоўны куе сваё шчасце, у краіне, дзе чалавек узнят на недасяжную вышыню, у краіне, дзе штодзенна, штогадзінна праяўляе клопаты вялікі **Сталін** аб кожным працоўным, маглі вырасці такія выдатныя людзі.

Лінія партыі на індустрыялізацыю краіны забяспечыла стварэнне і росквіт магутнай авіяцыйнай прамысловасці, якой раней у нас не было. Большэвікі партыйныя і непартыйныя перамаглі ўсе труднасці, якія стаялі на гэтым шляху, рашуча змяталі з дарогі ныцікаў і малавераў і пад геніяльным сталінскім кіраўніцтвам нястомна завяёвувалі перамогу за перамогай.

Сталінскія клопаты аб людзях, аб росце і выхаванні кадраў, аб дапамозе ім стварылі ўсе ўмовы для магутнага росквіту і росту невычарпальнай творчай энергіі і талентаў народаў нашай сонечнай радзімы.

Мужнасць, адважнасць, гераізм, большэвіцкая вытрыманасць і настойлівасць, яснасць мэты, бясконцая адданасць радзіме, вялікаму Сталіну — вось якасці, якімі ўладае совецкі лётчык.

Нашы лётчыкі не раз паказвалі ўсяму свету ўзоры геройства, мужнасці, адвагі, якіх яшчэ не ведаў свет.

У гады грамадзянскай вайны нашы совецкія лётчыкі, лятаючы на поўразбітых машынах, па праву называемых «трунамі», метка паражалі ворага, узброенага навейшымі машынамі.

Нашы героі Совецкага Саюза паказалі ўзоры мужнасці, геройства і адвагі ў выратаванні чэлюскінцаў. Гэта дата ўвойдзе ў сусветную гісторыю, як дата, не ведаўшая сабе роўных.

Нашы совецкія лётчыкі, навучаныя ў совецкіх школах, з поспехам авалодваюць складанай авіяцыйнай тэхнікай, пабудаванай на нашых совецкіх заводах і са сваіх матэрыялаў.

Працоўныя нашай радзімы ганарацца сваімі лётчыкамі, любяць сваю авіяцыю, шчыра вітаюць гордых сокалаў нашай краіны з высокай узнагародай.

Совецкая авіяцыя ў адрозненне ад буржуазнай з'яўляецца авіяцыяй, якая стаіць на варце міру, на варце абароны свяшчэнных і недатыкальных граніц Совецкага Саюза.

СССР самая міралюбівая краіна ў свеце. Але кожны працоўны нашай радзімы добра ведае, як фашысцкія спярвятнікі Германіі, Польшчы, Японіі і іншых краін прагнуць чалавечай крыві, шалёна рыхтуючыся да вайны, да нападу на адзіную ў свеце бацькаўшчыну працоўных усіх краін — СССР.

Германія, Польшча, Японія і іншыя імперыялістычныя краіны, шалёна рыхтуючыся да вайны, велізарнейшыя сумы ўкладваюць у авіяцыйнае будаўніцтва, на падрыхтоўку лётных кадраў. Авіяцыя ў будучай вайне будзе мець выключна вялікае значэнне.

«Мы стаім за мір і адстойваем справу міру, але мы не баімся пагроз і гатовы адказаць ударам на ўдар падпальнічыкаў вайны». Так заявіў правадыр і настаўнік нашай партыі вялікі Сталін.

І калі капіталісты папрабуюць сунуць сваё свіное рыла ў наш совецкі агарод, то наша доблесная непераможная Чырвоная армія і яе паветраны флот пад кіраўніцтвам першага маршала Совецкага Саюза любімага наркома Варашылава будзе біць ворага так, як яшчэ ніхто і ніколі не біў сваіх ворагаў.

Совецкія лётчыкі — гэта бязмежныя патрыёты радзімы, гэта мужныя, благародныя сыны нашага народу, гэта людзі, для якіх інтарэсы радзімы вышэй за ўсё. І гэтыя людзі за справу **Леніна—Сталіна** гатовы на любое геройства.

Сёння мы публікуем рад матэрыялаў, у якіх расказваецца, як людзі авалодваюць складанай авіяцыйнай тэхнікай, як яны змагаюцца за выкананне ўказанняў партыі і ўрада.

Магутны стаханаўскі рух ахапіў усю нашу краіну магутнай хваляй, ахапіў і Чырвоную армію і яе паветраны флот.

Множацца рады стаханаўцаў-лётчыкаў, выдатна аўладаўшых ваеннай тэхнікай і выдатна выконваючых заданні.

Працоўныя Совецкай Беларусі, працуючы на рубяжы з капіталістычным светам, як і працоўныя ўсяго Совецкага Саюза, з асаблівай радасцю і ўвагай сустрэлі пастанову ўрада Саюза аб узнагародзе лётчыкаў-стаханаўцаў.

Народы Совецкай Беларусі з асаблівай увагай і любоўю назіраюць за кожным поспехам нашых совецкіх лётчыкаў.

Нам, працуючым на рубяжы з капіталістычным светам, першым прыдзецца адбіваць напад ворага.

Вось чаму кожны поспех нашай Чырвонай арміі ёсць велізарная радасць усяго беларускага народу.

Мацаваць абароназдольнасць краіны, акружыць яшчэ большай увагай і клопатамі нашу доблесную Чырвоную армію, авалодваць ваеннай тэхнікай — пярвейшая задача партыйных, профсаюзных і комсамольскіх арганізацый.

Авіяцыя, парашутызм сталі самым любімым спортам совецкай моладзі. Тысячы юнакоў і дзяўчат без адрыву ад вытворчасці авалодваюць парашутнай і авіяцыйнай справай. Прага да аўладання авіяцыйнай тэхнікай у нашай моладзі велізарная.

Кожны працоўны, дзе-б ён ні працаваў, па меры сіл авалодвае ваеннай справай. Кожны працоўны добра ведае, што аўладанне ваеннай тэхнікай неабходна для разгрому адважыўшагася напасці на нас ворага.

І калі ў належны момант патрэбуе партыя і ўрад, то народы Совецкай Беларусі, як і народы ўсяго Совецкага Саюза, дадуць не малую колькасць бясстрашных лётчыкаў, танкістаў, артылерыстаў, кавалерыстаў, бясстрашных байцоў, якія дасканала ўладаюць сучаснай тэхнікай.

Беларускі народ, які прайшоў суровую школу барацьбы, народ, які пераносіў нечалавечыя здзекі і гвалт і рускіх Аракчэевых, і нямецкіх баронаў, і польскіх паноў, народ, які дзякуючы партыі і вялікаму **Сталіну** атрымаў шчаслівае радаснае жыццё, — гэты народ, калі адважыцца напасці на нас вораг, будзе да апошняй кроплі крыві змагацца за чэсць і славу радзімы, за справу **Леніна—Сталіна.**

Палі Херсоншчыны пакрыліся густой, высокай, запацістай пшаніцай. Калгасы рыхтуюцца збіраць ураджай. НА ЗДЫМКУ: інспектар па якасці калгаса імя Петроўскага, Херсонскага раёна, Одэскай вобласці тав. А. Ф. Гарнуша і калгаснік тав. Г. Л. Кравец агледжваюць жыта. Фото Петражыцкага (Саюзфото).

ПЕРАМОГА БАСТУЮЧЫХ МЕТАЛІСТАЎ ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 1 чэрвеня. (БЕЛТА). У рэзультаце перагавораў прадстаўнікоў міністэрства працы з дэлегатамі 50 тысяч бастуючых металістаў Парыжскай акругі, у прынцыпе дасягнута пагадненне аб увядзенні ў дзеянне калектыўных дагавораў. Прадпрыемцы ў прынцыпе прызналі правы профсаюзных арганізацый, а таксама згадзіліся са стварэннем інстытута рабочых дэлегатаў. Прадпрыемцы, асабліва настойвалі на тым, каб рабочыя пакінулі занятыя імі раней прадпрыемствы. Дэлегаты профсаюзаў абяцалі садзейнічаць хутчэйшай ліквідацыі канфлікту.

Да гэтага часу заняты рабочымі заводы «Лавалет» у Сэнт-Уапс, «Дэлонэ» ў Бельвілі і рад іншых. Згодна вестак друку, каля 10 тыс. рабочых прадаўжаюць баставаць і займаць прадпрыемствы.

* * *

ПАРЫЖ, 31 мая. (БЕЛТА). Газета «Юманітэ» расцэньвае ўмовы сканчэння забастоўкі металістаў, як перамогу рабочых. Згодна даных газеты 50 тыс. баставаўшых металістаў дабіліся ў той ці іншай меры задаволення сваіх патрабаванняў, а іменна — павелічэння на 3 — 6 франкаў у дзень зарплаты, аплаты водпускаў, прызнання прадпрыемцамі інстытута цэхавых дэлегатаў і наогул права рабочых арганізоўвацца ў профсаюзы, скасавання штрафаў, аплаты за дні забастоўкі і т. д.

З'езд сацыялістычнай партыі прыняў рэзалюцыю, у якой вітае рух металістаў Францыі.

Перад стварэннем новага французскага урада

ПІСЬМО САКРАТАРЫЯТА ФРАНЦУЗСКАЙ КОМПАРТЫІ

ПАРЫЖ, 31 мая. (БЕЛТА). Сакратарыят французскай компартыі звярнуўся да з'езда сацыялістычнай партыі з пісьмом, у якім заяўляе, што ўрад, сфармаваны Блюмам, будзе **пры правядзенні праграмы народнага фронта карыстацца нязменным падтрыманнем комуністаў.** Сакратарыят компартыі падкрэслівае далей, што поспех барацьбы за праграму народнага фронта можа быць забяспечаны пры ўмове, калі гэта барацьба будзе апірацца на дзеянні шырокіх мас па-за парламентам. Таму компартыя зноў прапануе стварыць па ўсёй краіне камітэты народнага фронта.

Падкрэсліўшы далей неабходнасць адзінства рабочага класа, сакратарыят прапануе склікаць у бліжэйшым будучым канферэнцыю ў складзе прадстаўнікоў французскай комуністычнай і сацыялістычнай партый, англійскай рабочай партыі і II Інтэрнацыянала.

МЯРКУЕМЫ СКЛАД ГАБІНЕТА

ПАРЫЖ, 31 мая. (БЕЛТА). Згодна вестак газеты «Эко дэ Пары» склад габінета Леона Блюма намячаецца ў наступным выглядзе: прэм'ер — Блюм, віцэ-прэм'ер і міністр юстыцыі — сенатар Стэг (дэмакратычная левая група сената), міністр замежных спраў — Івон Дэльбос (радыкал-сацыяліст), міністр фінансаў — Венсен Орыоль (сацыяліст), ваенны міністр — Далад'е (радыкал-сацыяліст), морскі міністр — Кампінкі (радыкал-сацыяліст), міністр пошты і тэлеграфа — Жардыйе (сацыяліст), міністр унутраных спраў Салангро (сацыяліст), міністр грамадскіх работ Леба (сацыяліст) міністр авіяцыі — Кот (радыкал-сацыяліст), міністр асветы Шотан (радыкал-сацыяліст), міністр калоній Марыус Мутэ (сацыяліст) ці Тасаў (радыкал-сацыяліст), міністр земляробства Моннэ (сацыяліст), міністры без партфеляў — сенатары Поль Бонкур і Віолет (абодва з партыі «Сацыялістычны саюз»), стэйт-сакратар пры старшыні совета міністраў Спінас (сацыяліст), таварыш міністра па замежных справах Бено («Сацыялістычны саюз»), таварыш ваеннага міністра Рукар (радыкал-сацыяліст).

ХВАЛЯВАННІ Ў ПАЛЕСТЫНЕ



Хваляванні ў Палестыне ўзмацніліся. Адбываюцца сутычкі і налады арабаў на паліцыю і войскі. НА ЗДЫМКУ: англійскі патруль ў г. Хайфе ля дротавых агарод. (Саюзфото).

ЛОНДАН, 31 мая. (БЕЛТА). Сутычкі з паліцыяй і войскамі ў Палестыне прадаўжаюцца. У Рамле арабы закідалі каменнямі ваенную ахову пошты. Войскі адкрылі агонь. Ранены два арабы. Увечары ў будынак пошты была кінута бомба.

Сем'і брытанскіх падданых у Рамле пераведзены на англійскі аэрадром, які знаходзіцца за горадам. У Ліддзе адбылася жорсткая сутычка паміж ваенным патрулём і ўзброенымі арабамі.

Новая правакацыя ў Паўночным Кітаі

БЕРЛІН, 31 мая (БЕЛТА). Германскія газеты надаюць вялікае значэнне новаму япона-кітайскаму інцыдэнту (узрыў бомбы на чыгуначным участку каля Цяньцзіна). На думку газет інцыдэнт з'явіцца пачаткам новых сур'ёзных японскіх дзеянняў у Паўночным Кітаі.

Газета «Берлінер тагеблат» піша: «Інцыдэнт можа ўдала прыкрыць узмоцненую экспансію Японіі ў 5 паўночных правінцыях Кітая».

ЗАБОЙСТВА 300 КІТАЙСКІХ РАБОЧЫХ

БЭЙПІН, 30 мая. (БЕЛТА). За апошнія некалькі тыдняў на рацэ Хайхэ (Паўночны Кітай) было выяўлена звыш 300 усплыўшых трупаў. У кітайскіх колах думаюць, што гэта — трупы рабочых, якія былі заняты на сакрэтных ваенных работах, што праводзіліся японцамі ў ваколіцах Цяньцзіна. Тут думаюць, што пасля сканчэння работ занятыя на будаўніцтве кітайскія рабочыя былі ўтоплены ў рацэ ў мэтах захавання тайны будаўніцтва.

Сярод антыяпонскіх лозунгаў на дэманстрацыі, якая адбылася ў Цяньцзіне 28 мая, быў таксама лозунг: «Адпомсцім за забойствы кітайскіх рабочых».

ВЯЛІКАЯ АНТЫФАШЫСЦКАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ Ў БУХАРЭСЦЕ

БУХАРЭСТ, 31 мая (БЕЛТА). Сёння ў Бухарэсце адбылася грандыёзная дэманстрацыя, арганізаваная нацыянал-парасіцкай (сялянскай) партыяй Румыніі. Дзесяткі тысяч мужчын, жанчын і дзяцей з плакатамі і лозунгамі арганізавана праходзілі па вуліцах. Лозунгі на плакатах гаварылі: «Няхай жыве народны фронт!», «Далоў фашыстаў!», «Далоў шпіёна Вебера!» (карэспандэнт «Фелькішэр бэабахтэр»). Жаночыя арганізацыі ішлі пад лозунгамі: «Патрабуем хлеба і работы», «Далоў вайну».

Групы фашысцкіх студэнтаў, узброеных палкамі і каменнямі, зрабілі рад нападаў на дэманстрацыю, прабуючы яе дэзарганізаваць, але конныя і пешыя атрады «сялянскай гвардыі» паспяхова адбівалі напады фашыстаў.

КРЫВАВАЯ РАСПРАВА З СЯЛЯНАМІ

ПАРЫЖ, 31 мая. (БЕЛТА). Агенцтва Гавас паведамляе з Мадрыда аб крывавых падзеях у вёсцы Іест (правінцыя Альбасета). Сяляне гэтага населішча захапілі памешчыцкую сядзібу і высеклі 12 тыс. дрэў у лесе, які належыць памешчыку. Умяшалася жандармерыя, і завязалася перастрэлка, якая цягнулася больш 4 гадзін. Забіта 22 і ранена 40 сялян. Адзін жандар забіт, 3 цяжка ранены.

ВЫЕЗД СВЕДКІ МАТВЕЕВА Ў СССР

У рэзультаце прадпрынятых паўпрэдствам СССР у Гельсінгфорсе, па даручэнню совецкага ўрада, рашучых крокаў фінляндскія ўлады дазволілі гр. Матвееву выехаць з Фінляндыі. Перад ад'ездам гр. Матвееў даў у памяшканні паўпрэдства СССР генеральнаму сакратару дзяржаўнай пракуратуры Фінляндыі паказанні, у якіх пацвердзіў сваю заяву паўпрэдству аб пагрозах і насіллях, якім ён падвяргаўся ў Гельсінгфорсе.

З ГАДЫ ЧЭЛЯБІНСКАГА ТРАКТАРНАГА ЗАВОДА

Пісьмо калектыва ЧТЗ таварышу СТАЛІНУ

МАСКВА, 31 мая (БЕЛТА). Калектыў чэлябінскага трактарнага завода імя Сталіна у сувязі са споўніўшымся трохгоддзем з дня пуску завода звярнуўся з пісьмом да таварыша Сталіна, чый магутны геній натхняў будаўнікоў гіганта трактарабудаўніцтва.

«За тры гады, — гаворыцца ў пісьме, — наш завод даў краіне больш 44 тыс. магутных машын, 2,600 тысяч конскіх сіл. У снежнай Якуціі, на высокіх гарах Паміра, у стэпах Дона і палях чорназемнай Украіны, на Урале, у Сібіры стаханаўцы калгасаў і саўгасаў лічаць за гонар прапаваць на трактары «Сталінец» — надзейным памочніку ў барацьбе за вытворчасць 7—8 мільярдаў пудоў хлеба. Калгасная моладзь складае песні аб гэтай цудоўнай машыне.

Нялёгка было ўчарашнім землякопам, каменшчыкам, бетоншчыкам, атынкоўшчыкам асвоіць складаную тэхніку трактарабудаўніцтва. Але кожнага з нас натхняла і клікала наперад тваё ўказанне аб тым, што мы павінны дапоўніць пафас будаўніцтва пафасам асваення новых заводаў і новай тэхнікі.

Яркі прамень твайго генія асвятляў нам шлях да перамог. Мы ў 3,5 разы паднялі прадукцыйнасць працы ў параўнанні з першым кварталам 1934 года. А за апошнія два гады больш чым у 2 разы знізілі сабекошт трактара.

Зараз калектыў завода ўсю сваю ўвагу накіроўвае на выкананне даручанай яму партыяй і ўрадам адказнай задачы — наладзіць вытворчасць трактараў з дызельматорам».

Пісьмо заканчваецца словамі:

«Родны наш Іосіф Вісарыёнавіч! Калектыў чэлябінскага трактарнага завода натхнён жаданнем даць яшчэ больш магутныя і дасканалыя машыны на палі нашай сацыялістычнай радзімы. Мы ўпэўнены ў сваіх сілах. Мы горды, што працуем на заводзе, які носіць тваё імя, імя вялікага правадыра.

Няхай жыве партыя Леніна—Сталіна! Няхай жыве наш родны, наш любімы **Сталін!**»

Прывітанні юбіляру

ЧЭЛЯБІНСК, ТРАКТАРНЫ ЗАВОД — ТАВ. БРУСКІНУ.

Горача віншую калектыў завода з 3-й гадавінай пуску і дасягнутымі поспехамі. Аўладанне вытворчасцю магутных гусенічных трактараў з'яўляецца велізарным укладам у справу сацыялістычнай перабудовы нашай сельскай гаспадаркі, умацавання сацыялізма ў нашай краіне.

Жадаю слаўнаму калектыву завода, які носіць імя вялікага Сталіна, далейшых поспехаў у галіне паляпшэння якасці трактараў, асваення дызеляў, павышэння рэнтабельнасці на базе магутнага разгортвання стаханаўскага руху.

Нам. наркома цяжкой прамысловасці ПЯТАКОЎ.

* * *

У сувязі з 3-й гадавінай чэлябінскага трактарнага завода шлю гарачае большэвіцкае прывітанне рабочаму калектыву і інжынерна-тэхнічнаму персаналу завода.

Чэлябінскі трактарны завод імя Сталіна вось ужо тры гады асвятляе нашу сацыялістычную сельскую гаспадарку цудоўнымі, магутнымі і высокапрадукцыйнымі трактарамі «Сталінец».

Кожны дзень з канвеера ўходзяць на бязмежныя калгасныя палі магутныя калоны «Сталінцаў». Яны пад вадзіцельствам перадавых людзей калгаснай вёскі ўзнімаюць ураджайнасць сацыялістычных палёў і ўмацоўваюць абароназдольнасць нашай сацыялістычнай радзімы.

Жадаю калектыву чэлябінскага завода і надалей па-стаханаўску біцца за выкананне і перавыкананне вытворчага плана выпуску «Сталінцаў».

Няхай жыве наша комуністычная партыя і правадыр і арганізатар пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва таварыш **Сталін!**

Народны камісар земляробства Саюза ССР М. ЧЭРНОЎ.

ПЕРШЫ Ў СЯРЭДНЯЙ АЗІІ НАФТАПЕРАГОННЫ ЗАВОД

АШХАБАД, 1 чэрвеня. (БЕЛТА). На Нафтадагскай гары, дзе на прапягу стагоддзяў перасоўваліся пясчаныя барханы, вырас першы ў Сярэдняй Азіі нафтаперагонны завод. З 24 мая завод знаходзіцца ў пускарым перыядзе. Першыя дні пробнага пуску паказалі, што агрэгаты і апаратура працуюць зусім здавальняюча. Па плану Галоўнафты завод павінен уступіць у эксплаатацыю 1 ліпеня.

Калектыў завода паставіў перад сабой задачу — пусціць завод раней намечанага тэрміну. Завод будзе пераапрацоўваць каля 700 тон нафты ў суткі. Да канца года ён павінен пераапрацаваць 100 тыс. тон нафты.

Сакратар ЦК КП(б)Б тав. ВАЛКОВІЧ на будаўніцтве менскага палаца піонераў

У дзень усенароднага свята — 11 ліпеня — дзетвара сталіцы рэспублікі атрымае новы палац піонераў. Ужо закончана штукатурка. У разгары кладка паркета, скульптурна-лепныя і масляныя работы. Распачата знатворная апрацоўка сцен мраморнай крошкай. Абсталёўваецца радыё- і фоталабараторыі. Гомельскі шклозавод прыслаў высокаякасныя люстры.

Будаўнікі палаца піонераў з любоўю апрацоўваюць кожную рэч. Стаханаўская брыгада Хмыза дзённыя нормы па мазаічных работах выконвае на 220—240 проц. пры высокай якасці работы. Брыгада штукатураў Радзівіцкага сваю норму выконвае на 220—230 проц.

1 чэрвеня будаўніцтва Палаца наведалі сакратар ЦК КП(б)Б тав. **Валковіч, тт. Дзякаў, Гершон і Готфрыд.** Яны агледзелі ўсе пакоі Палаца, азнаёміліся са скульптурамі і лепнымі работамі. (БЕЛТА).

Тлумачэнне Наркамзема БССР

Зарэгістраваны факты, што ў калгасах «Чырвоная Тураўшчына» і імя Гікало, Запясоцкага сельсовета, Тураўскага раёна, у калгасе імя XVII партз'езда, Людзяневіцкага сельсовета, Жыткавіцкага раёна, калгасе імя Дзержынскага, Браняспаўскага сельсовета, Жыткавіцкага раёна, калгасе «Чырвонае Куляшова», Гарбашоўскага сельсовета, Расонскага раёна, калгасе «Сейбіт», Бабуніцкага сельсовета, Петрыкоўскага раёна, калгасе «Профінтэрн», Капцэвіцкага сельсовета, Петрыкоўскага раёна, «Чырвоная зорка», Лоеўскага раёна, налічваюць працадні саматужнікам (шаўцам, краўцам, цырульнікам) нечленам калгаса за выкананыя імі работы для калгасаў і калгаснікаў. У гэтых-жа калгасах былі выпадкі, што працадні за работы, выкананыя па заказах калгаснікаў, пералічваліся з рахунка калгасніка, даўшага заказ, на рахунак саматужніка.

Падобная практыка з'яўляецца няправільнай.

Наркамзем БССР прапануе ўсім загадчыкам раённых зямельных аддзелаў і дырэктарам МТС праверыць наяўнасць падобных фактаў і адмяніць усе выпадкі пералічэння працадзён калгаснікаў з іх асабістых рахункаў на рахунак саматужнікаў.

Калгасы і калгаснікі разлічваюцца з саматужнікамі за выкананую работу згодна дагаворанасці, і працадні за выкананне гэтых работ налічваць нельга. Таксама не налічваюцца працадні за работы, якія выконваюцца саматужнікамі для калгасаў, калі гэтыя саматужнікі не з'яўляюцца членамі калгаса.

Нарком земляробства К. БЕНЕК.

ПЕРАМОГА ВОДНІКАЎ БССР

ГОМЕЛЬ. (Па тэлеграфу). 29 мая Днепрадзвінскае параходства датэрмінова выканала красавіцка-майскі план. Перавезена 401,4 тысячы тон грузаў (59,5 мільёнаў тонакілометраў).

Лепшыя ўзоры работы ў перавозках нанні плана паказалі каманды буксірных параходаў: «Тухачэўскі» (капітан Ганчароў, механік Шчапавлаў), «Энгельс» (капітан Шараў, механік Харэл), «Большэвік» (капітан Гладкоў, механік Іваноў); пасажырскія параходы — «Чычэрын» (капітан Чэвес, механік Жукаў), «Беларусь» (капітан Курчын, механік Гаілаў) і інш.

Мабілізуемся на далейшую барацьбу за выкананне плана перавозак, разгортванне стаханаўскага руху і безаварыйную работу.

Начальнік параходства ГАЛАВАНАЎ.

Начальнік палітаддзела СУРЫГІН.

Старшыня рэчкома ВЛАСАЎ.

АБ ХОДЗЕ ЎЗДЫМУ ПАПАРАЎ У БССР

ПАСТАНОВА БЮРО ЦК КП(б)Б

ЦК КП(б)Б адзначае, што цэлы рад раёнаў або сарвалі зусім ранні тэрмін уздыму папару, як Полацкі, Асіпавіцкі, Добрушскі і Свяцілавіцкі раёны, не прыступіўшыя да гэтай работы, або праводзяць яе зусім нездавальняюча, як Лоеўскі, Жлобінскі, Сіроцінскі, Чачэрскі, Башанковіцкі, Хойніцкі і інш. раёны, выканаўшыя на 25 мая ўсяго ад 3 да 10 проц. плана.

Тая акалічнасць, што рэспубліканскі план уздыму папараў выканан не 25 мая толькі на 32 проц., сведчыць аб тым, што гэта сур'ёзнейшая работа па забеспячэнню высокага ўраджаю ў рэспубліцы не сустракае з боку раённых партыйных і совецкіх арганізацый сур'ёзнай увагі і праходзіць самацёкам.

ЦК патрабуе ў дэкадны тэрмін скончыць уздым папару і абавязвае сакратароў райкомаў, старшынь РВК і дырэктароў МТС і саўгасаў забяспечыць у гэты тэрмін работу кожнага трактара і не менш 80 проц. цягла на ўздыме папару.

ЦК абавязвае РК КП(б)Б і РВК прыцягваць да найстражэйшай адказнасці асоб з кіруючага складу калгасаў, не скарыстоўваючых цягавую сілу на ўздыме папару.

ЦК падкрэслівае, што работа па ўздыму ранняга папару таксама важная і адказная ў агульнай суме мерапрыемстваў барацьбы за ўраджай, як і ранняя сяўба, і папярэджвае сакратароў РК і старшынь РВК, што эператыўнае кіраўніцтва ўздымам папару ў раёне з боку РК і РВК павінна быць пастаўлена таксама, як і веснавой сяўбой.

ЦК абавязвае сакратароў РК КП(б)Б і старшынь РВК да 10 чэрвеня поўнасцю выканаць план уздыму папару, прасачыўшы за тым, каб ні ў якім выпадку пад узорванне папару не траплялі выганы і пашы.

РАЗГОРНЕМ УСЕБЕЛАРУСКАЕ СПАБОРНІЦТВА ЦАГЕЛЬНІКАЎ ЗА ДАСТОЙНУЮ СУСТРЭЧУ 11 ЛІПЕНЯ

Стаханаўцы цэха абпальвання гомельскага цагельнага завода № 6 звярнуліся з пісьмом да ўсіх цагельнікаў БССР. Яны прапануюць разгарнуць спаборніцтва цагельных заводаў на лепшую сустрэчу свята 11 ліпеня на права падпісаць пісьмо да таварыша Сталіна.

— 11 ліпеня, — гаворыцца ў пісьме, — беларускі народ будзе падагульваць вынікі велізарнейшых перамог, атрыманых на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва. Вынікі работы цагельных заводаў будуць вельмі дрэнныя, калі мы зараз-жа не палепшым работу, рашуча не ліквідуем ганебнае адставанне. ЦК КП(б)Б, Соўнарком Беларусі і асабіста тав. Гікало паставілі перад намі, цагельнікамі, выключна адказную і баявую задачу — даць у 1936 годзе нашай краіне 500 мільёнаў штук цаглін. Выконваем мы пакуль яшчэ гэту задачу вельмі дрэнна.

Трэба дабіцца рэзкага паляпшэння работы. Да 11 ліпеня цагельная прамысловасць, таксама як і другія галіны народнай гаспадаркі, павінна прыйсці з новымі поспехамі. Усе ўмовы і магчымасці для гэтага ёсць. Трэба толькі па-большэвіцку ўзяцца за справу.

Мы, стаханаўцы цэха абпальвання (двух гофманаўскіх пячэй) гомельскага цагельнага завода № 6, дабіліся штодзённага выпуску нашым цэхам 70—72 тысяч штук цаглы замест нормы ў 64 тысячы. Бярэм на сябе абавязацельства да 11 ліпеня давесці штодзённы выпуск да 75 тыс. штук цаглы. Гадавое заданне 20 мільёнаў штук цаглы перавыканаем, дамо 21 мільён штук гадавой прадукцыі. Наш выклік да астатніх цэхаў завода аб падняцці прадукцыйнасці аднадушна прынят. Рабочыя цэха сырцу абавязаліся выпусціць 22 мільёны штук сырцу замест нормы 20 мільёнаў, па гамоўцы 125 тысяч штук цаглы ў дзень замест нормы 100 тысяч, а па прэсах замест нормы 124 тысячы штук у дзень 150 тысяч.

Тав. цагельнікі БССР! Выклікаем вас на спаборніцтва. Разгорнем усебеларускае соцыялістычнае спаборніцтва цагельных заводаў, цэхаў, брыгад, асобных рабочых на дастойную сустрэчу ўсенароднага свята 11 ліпеня, за права подпісу пісьма таварышу Сталіну. Няхай да 11 ліпеня не будзе ні аднаго адстаючага цагельнага завода. Няхай цагельнікі разам з усім беларускім народам у дзень 11 ліпеня з гонарам раскажуць аб сваіх вытворчых поспехах.

Стаханаўцы гомельскага цагельнага завода № 6.
(25 подпісаў).

У АДКАЗ НА ПРЫВІТАННЕ ТАВАРЫША Н. Ф. ГІКАЛО

ГОМЕЛЬ. (Спец. кар. «Звязды»). 29 мая на ўсебеларускай радыёперакліччы цагельных заводаў т. Готфрыд перадаў прывітанне ад т. Гікало стаханаўцам і кіраўніцтву цагельнага завода № 6 за перавыкананне плана выпуску цаглы. У сувязі з гэтым 30 мая на заводзе адбыўся мітынг рабочых. Паведамленне аб тым, што тав. Гікало перадаў прывітанне, было сустрэта з вялікім уздымам. Выступаўшыя на мітынгу стаханаўцы бралі на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў і абяцалі тав. Гікало вывесці завод у перадавыя рады па рэспубліцы. Аднадушна прынят выклік стаханаўцаў перадавога цэха абпалення, якія ў сваім пісьме да ўсіх цагельнікаў БССР прапануюць арганізаваць спаборніцтва на дастойную сустрэчу 11 ліпеня. Па заводу разгортваецца спаборніцтва брыгад, цэхаў і асобных рабочых. Брыгада абаротчыкаў печы № 1, якая перавыконвае норму падвозкі сыравіны к печы — 2.800 — 2.900 шт., замест нормы 2.600 штук, абавязалася давесці падвозку да 3.500 шт. і выклікала на соцспаборніцтва брыгаду абаротчыкаў печы № 2.

Стаханавец Барабанаў, які пры норме пасадкі ў печ 18 тысяч цаглы садзіць 21 тысячу, узяў на сябе абавязацельства давесці колькасць пасадкі да 25 тысяч штук. У спаборніцтва ўключыліся і ўзялі на сябе канкрэтныя абавязацельствы па перавыкананню норм стаханаўцы Кісялёў, Шкопыч, Лысякоў і інш.

ВЫКЛІК КАМБІНАТА „СПАРТАК" ПРЫНЯТЫ

Рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі і служачыя менскай кандзіцерскай фабрыкі «Комунарка» абмеркавалі прапанову бабруйскіх калгаснікаў і выклік камбіната «Спартак».

«30 мая — пішуць яны ў сваім пісьме — мы датэрмінова на адзін месяц выканалі поўгадавы план і цяпер бярэм на сябе наступныя абавязацельствы:

данае абавязацельства наркому тав. Мікояну выпусціць у 1936 годзе прадукцыі звыш плана на адзін мільён рублёў выканаць да 11 ліпеня;

асвоіць і ўкараніць у вытворчасць 6 новых гатункаў высокаякасных шакаладных цукерак і 6 новых гатункаў мучністых вырабаў;

падрыхтаваць да сістэматычнага выпуску дзіцячы асартымент вырабаў;

дабіцца на працягу чэрвеня якасці прадукцыі не ніжэй як 93 балы (100 проц. плана) па масавых гатунках і 94 балы па цуберках вышэйшай якасці;

да 10 чэрвеня арганізаваць школу стаханаўцаў на 40 чалавек;

ахапіць тэхвучобай 100 проц. новых рабочых;

усім завёртчыцам вывучыць тэхмінімум;

да 5 чэрвеня правесці выпуск рабочых, якія займаюцца ў гуртках па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці і ахапіць вучобай усіх непісьменных і малапісьменных;

упагнуць ва ўсе галіны культурна-бытавога і вытворчага жыцця фабрыкі жонак інжынерна-тэхнічных работнікаў і стаханаўцаў;

узорна правесці аздараўленчую кампанію сярод дзяцей рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых і арганізаваць агульнафабрычны піонерскі лагер».

Трыкутнік фабрыкі: ПУЗАНАЎ, РАБКІН, ЭПШТЭЙН.
Стаханаўцы: СІНДЛЕР, ГУНЬКО, ЦЫГЕЛЬНІЦКАЯ.

НА ПОЎДНІ СОВЕЦКАГА САЮЗА

У калгасах Сочынскага раёна, Азова-Чорнаморскага края, паспелі чарэшні. НА ЗДЫМКУ: калгасніца калгаса імя Красіна тав. Р. УЛІХ за зборам чарэшні. Фото Хельмера (Саюзфото).

НАШ ПЕРШЫ ВОПЫТ

Па вопыту калінінцаў мы ў сябе на фабрыцы 25 мая арганізавалі сквазную брыгаду. Гэта брыгада аб'яднае ўсе тры змены другога ўчастка трыкатажнага цэха. Цэхі гэтыя залежаць адзін ад другога. Матальны цэх забяспечвае прадзівам трыкатажны, апошні канчаткова выпрацоўвае палатно, якое ідзе на швайную фабрыку «КІМ». Аб вопыце першых дзён работы сквазной брыгады мы хочам падзяліцца з іншымі прадпрыемствамі праз «Звязду».

Некалькі слоў аб праробленай намі падрыхтоўчай рабоце. Мы старанна праверылі абсталяванне абодвух участкаў. Адрамантавалі 50 кантрольна-нацяжных прыбораў матальных машын. Хуткасць машын давялі да 1.100 абаротаў у мінуту, як было вырашана на галіннай канферэнцыі.

Для таго, каб канчаткова ліквідаваць абязлічку і гэтым узмацніць адказнасць саміх работніц, мы ўнутры сквазной брыгады да кожнай трыкатажнай машыны прымацавалі тры матальныя машыны. Прыклеілі спецыяльныя ярлычкі з указаннем, што такія і такія нумары матальных машын забяспечваюць прадзівам такія і такія нумары трыкатажных машын. І цяпер кожная трыкатажніца ведае, якая іменна матальшчыца яе абслугоўвае, і ў выпадку няправільнай намоткі яна ўжо ведае, з каго канкрэтна патрабаваць адказнасці за дрэнную работу. Апрача таго з мэтай ухілення ад нясвоечасовай падачы прадзіва мы так арганізацыйна пабудавалі работу сквазной брыгады, што трыкатажніц, працуючых на ранішняй змене, прадзівам забяспечваюць матальшчыцы, працаваўшыя ў папярэдняй начной змене.

Першыя дні работы сквазной брыгады даюць ужо выдатны эфект. Да арганізацыі сквазной брыгады гэты-ж дзесяты ўчастак трыкатажнага цэха выконваў свой план на 85—86 проц. Сёння промфінплан гэтым участкам выконваецца на 100—103 проц. Яшчэ адзін паказальнік. Да 25 мая ні адна работніца з 18 працуючых на даным участку не выконвала новай нормы выпрацоўкі. Цяпер-жа 13 работніц сістэматычна выконваюць і перавыконваюць новую норму, астатнія таксама пчыльна падыходзяць да выканання.

Такое-ж становішча і на другім участку матальнага цэха. Калі раней з 48 чалавек, працуючых на даным участку, новую норму выпрацоўкі не выконвала 25 чалавек, то зараз невыконваючых ёсць усяго толькі 7 чал. Рад работніц, напрыклад, т. Зайцава, новую норму выпрацоўкі выконвае на 130 проц. Замест 118 шпуль па норме яна наматвае 155 шпуль. Да арганізацыі сквазной брыгады яна сваю норму выконвала на 105—107 проц. Работніцы Бяляева і Мясаедава да сквазной брыгады ледзь выконвалі сваю норму на 96—98 проц. Сёння яны выконваюць яе на 108 і больш проц. і т. д.

Усё-ж гэту брыгаду пакуль яшчэ нельга назваць пагалоўна стаханаўскай. Але яна з'яўляецца яркім паказальнікам таго, што ў бліжэйшы час яна будзе пагалоўна стаханаўскай. Мы яшчэ таксама не падвялі вынікаў выканання промфінплана (вынікі падводзяцца за кожную пяціднеўку), але ўжо зараз мы можам адзначыць, што якасць як прадзіва, так і гатовага палатна значна павысілася.

У сучасны момант мы практыкуем сустрэчы работніц сквазной брыгады — трыкатажніц з матальшчыцамі. На гэтых сустрэчах таварышы дзеляцца вопытам сваёй работы.

Дырэктар віцебскай панчошна-трыкатажнай фабрыкі імя Клары Цэткін інжынер МАКАЦЭВІЧ І. Ф. Начальнік планавага аддзела фабрыкі ЭПШТЭЙН М. Я.

Абмеркаванне праекта пастановы ЦВК і СНК Саюза ССР

ПІСЬМО МАЦЕРЫ АДЗІНАЦЦАЦІ ДЗЯЦЕЙ

Полацкая акруговая газета «Большэвік Полаччыны» змяшчае на сваіх старонках пісьмо жонкі рабочага Веры Аляксандраўны Жукоўскай — маціры 11 дзяцей. Тав. Жукоўская ў сваім пісьме піша:

«Я — маці 11 дзяцей — горача вітаю праект закону, які сведчыць аб клопатах нашай партыі і совецкай улады аб жанчыне. Як радасна цяпер жыць, калі бачыш, што дзень за днём жывецца лягчэй і весялей, калі штодзенна бачыш, як клапоцяцца аб нас і нашых дзецях наш любімы таварыш Сталін.

Я 11 разоў радзіла, абортаў не рабіла. Вырасціла 8 дзяцей. Трое памерлі тады, як была вайна, голад і холад. Цяжка мне было тады расціць сваіх дзяцей. Муж мой — рабочы, — у час рэвалюцыі пайшоў на вайну ваяваць з буржуямі, а мяне пакінуў з пяцьма дзецьмі. Старэйшаму было 12 год, а малодшаму некалькі месяцаў. Я ўсё перанесла і гадавала сваіх дзетак, пакуль муж ваяваў. Недарма большэвікі змагаліся з панамі і буржуямі: вось нам і добра стала жыць.

Я ганаруся сваімі дзецьмі, іх у мяне 6 сыноў і дзве дачкі. Тры сыны ў Чырвонай арміі і трох хутка перадам таварышу Варашылаву. Ды якія хлапцы! — здаровыя, прыгожыя. Жанчыны, следуйце майму прыкладу».

АБОРТЫ ЗАБАРАНЯЦЬ РАНА

Азнаёміўшыся з праектам пастановы ЦВК і СНК Саюза ССР аб забароне абортаў, аб дапамозе рожаніцам і т. п. жадаем таксама сказаць сваё слова.

Безумоўна, што жанчына, якая мае вялікую сям'ю, не можа прымаць актыўны ўдзел у грамадскім жыцці. Гэта ў асаблівасці датычыць жанчыны-маціры, якая жыве ў раёне, дзе нярэдка адсутнічаюць яслі, а маючыяся дзіцячыя сады не могуць ахапіць усіх дзяцей. Увядзенне закону аб забароне абортаў прымусіць жанчыну прыбягаць да «самааборту», што прадстаўляе сабой значна большую небяспеку, чым аборт.

Пры дазволе на правядзенне аборту неабходна зыходзіць з узросту маючыхся ў маціры дзяцей. Нярэдкі выпадкі, калі жанчына, маючы грудное дзіця, можа зноў стаць цяжарнай.

Мы лічым, што работнікі медыцыны павінны больш увагі надаць пытанню вывучэння сродкаў, якія перасцерагаюць жанчыну ад цяжарнасці, і шырэй папулярызаваць іх.

Р. ЦВЕЙ, Р. ГОЛУБ, Н. ЦІШКЕВІЧ, А. СТАНКЕВІЧ. м. Клічаў.

НАШЫ ПАПРАЎКІ І ДАДАТКІ

Жонкі інжынерна-тэхнічных работнікаў, стаханаўцаў і рабочых завода імя Варашылава (Менск) сабраліся ў свой клуб абмеркаваць праект закону аб забароне абортаў, павелічэнні матэрыяльнай дапамогі рожаніцам, устанаўленні дзяржаўнай дапамогі шматсямейным і т. д. Выступіўшыя тт. Лоскат, Айзман, Сегальчык, Шолкава і інш. унеслі рад паправак да праекту новага закону.

— Па-мойму, неабходна пры нашым заводскім клубе арганізаваць дзіцячы пакой, — гаворыць тав. Шолкава. — Гэта дасць магчымасць многім жонкам рабочых пакінуць у дзіцячым пакоі сваіх дзяцей, а самім пабываць на сходзе, паслухаць лекцыю, пайсці ў кіно ці тэатр.

— Я з радасцю вітаю праект новага закону, — гаворыць тав. Сегальчык. — Аднак у мяне ёсць папраўка. Пункт праекту, дзе гаворыцца аб устанаўленні даяржаўнай дапамогі шматсямейным, трэба змяніць і выдаваць аднаразовую даяржаўную дапамогу пры нараджэнні не восьмага дзіцяці, а пятага.

— Трэба праект дапоўніць такім пунктам, — прапануе тав. Круцялёва, — каб многасямейным давалі жыллёвую плошчу поўнасцю па нормах. Дапамогу на кармленне трэба выдаваць пры першых родах паранейшаму, 5 руб. у месяц, а пры далейшых родах паслядоўна павялічваць.

— Я супроць абортаў, — заяўляе тав. Айзман, — аборт калечыць жанчын. Многія жанчыны загубілі сваё здароўе і жыццё толькі з-за абортаў. Аднак нельга падыходзіць аднолькава да кожнай жанчыны. Тут неабходзен падыход да кожнай жанчыны-маціры ў паасобку. Бывае, што маці не можа працягваць цяжарнасць па хваробе, або па іншых якіх-небудзь прычынах. Такім маціры трэба дазваляць аперацыю аборту.

ФЕЛЕР. ЭЛЬТЭРМАН.

ГАВОРАЦЬ КАЛГАСНІЦЫ

ГОМЕЛЬ. З вялікай цікавасцю сустрэлі праект пастановы СНК СССР у калгасах Гомельшчыны. Асабліва актыўна прайшоў сход калгаснік у калгасе «Большэвік», Бабовіцкага сельсавета. Калгасніца Кірыкава Поля пры абгаварэнні праекта пастановы заявіла: «Я маю двух дзяцей, аборту ніколі не рабіла і адчуваю сябе здаровай. А вось Пузікава С. і Мельнікава А. ад абортаў сталі зусім непрацаздольнымі».

Калгасніца Палоннікава Поля з гонарам сказала:—У мяне 8 дзяцей. Хутка будзе дзевятае. Я адчуваю сябе здаровай, бо ніколі не рабіла абортаў. Мае дзеці вучацца, адно дзіця ходзіць у яслі. Трэба, каб яслі працавалі груглы год.

НЕ АРГАНІЗАВАЛІ АБМЕРКАВАННЯ ЗАКОНАПРАЕКТУ

У клубах, на пол. у сталоўцы, на вакзале — усюды чутны размовы аб праекце пастановы ўрада аб забароне абортаў і т. п. Праект выклікаў вялікую цікавасць з боку самых шырокіх мас працоўных. Але па віне многіх кіраўнікоў сельсавета працоўныя Будакашалёўскага раёна пакуль што пазбаўлены магчымасці арганізавана выказаць сваю думку, унесці свае прапановы да праекту.

Прайшло чатыры дні з часу апублікавання праекту, а па раёну праведзена толькі некалькі сходаў. Нават пасля таго, як райком КП(б)Б вынес пастанову, у якой абавязаў парторгаў склікаць сходы працоўных для абмеркавання праекту, справа не палепшылася.

У раённым пэнтры не праведзены ні аднаго схода жанчын. Толькі пасля напамінання райкома пярвічная партыйная арганізацыя чыгуначнікаў рашыла склікаць сход жанчын. Уся «падрыхтоўка» да схода выразілася ў тым, што на кавалку паперы, вырванай з блакнота, была напісана аб'ява. Не гледзячы на гэта на сход усё-ж прышло каля 20 жанчын. Парторг Рачынскі рашыў, што для яго гэта недастаткова і пасля таго, як жанчыны прасядзелі да 11 гадзін вечара, адклаў сход.

Там, дзе сходы праведзены, не ўсюды зразумелі, як паставіць абмеркаванне праекту. Парторг калгаса «Камінтэрн» тав. Хомчанка задаволена расказаў, што сход жанчын у калгасе прыняў пастанову: «Цалкам і поўнасцю згадзіцца з праектам». Ні аднаго дадатку, ні адной прапановы ці заўвагі на сходзе не было зроблена.

З. ЛОСЕЎ.

ДАДАТКІ КАЛГАСНІЦ ДА ПРАЕКТА ПАСТАНОВЫ

СМАЛЯВІЧЫ, 1 чэрвеня. (Кар. «Звязды»). Калгаснікі Смалявіцкага раёна актыўна абмяркоўваюць праект закону аб забароне абортаў, павелічэнні матэрыяльнай дапамогі рожаніцам і т. п. У калгасах адбываюцца сходы.

У калгасе «Пролетарскі ўдарнік», Слабодскага сельсавета, калгасніцы асаблівую ўвагу ўдзялілі пункту праекту аб забароне абортаў. Калгасніцы адабраюць пункт аб вылічэнні маці-калгасніцы аліментаў у прападзіных, патрабуюць лепш наладзіць дзіцячую кансультацыю, работу дзіцячых яслей і пляповак. Унесены дадаткі да законапраекту аб аказанні дапамогі калгасніцам-рожаніцам ў часе кармлення дзіцяці, а таксама аб большай адказнасці маціры за выхаванне дзяцей.

ЛОСЬ.

АБ ДЗІЦЯЧЫМ АСАРТЫМЕНЦЕ

Пасля работы Соня Гуравіч па звычаю заўсёды заходзіла ў дзіцячы універмаг. Яе ўжо тут добра ведалі ўсе прадаўшчыцы і, не чакаючы запытання, адказвалі з некаторым спачуваннем: «калясак няма».

Але аднойчы прадаўшчыца паведаміла, што прыбылі каляскі. Хутка доўгачаканая дзіцячая каляска «Мальпост» была дастаўлена дамоў. У сям'і было сапраўднае свята. Галоўным імяніннікам быў маленькі Гарык.

Соня Гуравіч была адной з тых шчаслівых матак, якім дасталася адна з гэтых калясак. У магазіне-ж было ўсяго 15 штук. Гарыку прышлося забаўляцца ў гэтай калясцы нядоўга. Праз дзесяць дзён усе планкі (драўляныя) з пярэдняй спінкі выскачылі са сваіх гнёздаў, скрапляючая паралельная планка расчапілася, выпаў вінт, расхісталіся бакі. Каляска, за якую заплацілі 138 руб. 25 кап., ператварылася ў кучу абломкаў.

Гэты сумны выпадак здарыўся тыдзень таму назад.

Гісторыя з каляскай «Мальпост» даволі павучальная. Цэлы год дырэкцыя менскага дзіцячага універмага дабівалася выканання заказу ад менскай арцелі «Спартак». Пал прыкрыццём розных аб'ектыўных прычын кіраўніцтва арцелі (старшыня Каган) ухілялася ад назойлівага заказчыка. І толькі пасля адпаведнага націску арцель прыступіла да вырабу дзіцячых калясак.

У маі была выпушчана першая партыя ў 25 штук. 15 калясак з труднасцямі дасталася дзіцячаму універмагу. Але-ж не паспелі склаці іх у магазін, як 4 каляскі адразу распаліся. У першы-ж дзень продажу адзін пакупнік прынёс купленую каляску назад, праз некалькі дзён яшчэ адзін.

Запрошаны ў магазін старшыня арцелі тлумачыў гэта тым, што нібы шофер пры перавозцы паламаў. «Пры выпрабаванні, — гаварыў ён,—нават дарослых садзілі ў гэту каляску і то вытрымлівалі». На гэтай падставе ён катэгарычна адмовіўся прымаць бракаваную прадукцыю назад. Яшчэ больш, ён збіраецца склікаць спецыяльную экспертную камісію для ўстанаўлення сапраўднага віноўніка.

У сваім пісьме ў рэдакцыю грамадзянка Гуравіч С. зусім правільна абурана гора-гаспадарчыкамі, якія выпускаюць для совецкага пакупніка бракаваны тавар, карыстаючыся дэфіцытнасцю даных рэчаў на рынку — «моў, усёроўна купяць».

Выпадак з каляскамі не адзіны. Хіба не здзекам над самымі юнымі пакупнікамі нашай краіны з'яўляецца работа менскай арцелі «ХУТМЮД», якая прадала дзіцячаму універмагу партыю плеценых неахайна зробленых дзіцячых ложкаў з чорнай, прагніўшай лазы? Або маленькія чамаданчыкі з замкамі, выпушчаныя без замкоў, ці лазовыя стульчыкі, якіх было выпушчана вельмі мала і якія да таго дрэнна апрацаваны (з цвікамі і клейкімі ручкамі).

Ужо даўно ідуць спрэчкі з арцеллю «Дрэваапрацоўшчык» аб вырабе дзіцячых ложкаў. Кіраўніцтва арцелі ні за што не бярэцца за гэты заказ. Ім значна выгаднейвыробляць буфеты, дываны і т. д.

Возьмем простую драўляную лапатку. Калісьці яе выраблялі ў вялікай колькасці саматужнікі-адзіночкі з старых скрынь. Калі-ж прапанавалі арцелі «Метраінструмент» заняцца вырабам гэтых лапатак, то тут абурыліся: «Мы не можам так хутка перабудавацца. Толькі праз поўгода можа што-небудзь выйдзе ў нас. Ды да таго ў нас і скрынак няма».

Дзіцячы більярд, выпушчаны гэтай арцеллю з сырога матэрыялу, патрэскаўся, і да сёнешняга дня валяецца ў магазіне 40 штук, не знаходзячы пакупніка.

Дзесяткі, сотні мацярэй наведваюць штодзенна дзіцячы універмаг. Яны хочуць купіць для сваіх дзяцей прыгожы каспюмчык, шапачку, сукеначку, панчошкі. Але-ж, на вялікі жаль, іх сур'ёзнага і правільнага патрабавання не задавольваюць.

Спрабуйце знайсці ў менскіх магазінах дзіцячыя трусікі. Дарэчна, нідзе іх не знойдзеце. А майкі, саколкі, шаўковыя фескі, наскі? Трыкатажная арцель імя Крупскай (Менск) ахвотней бярэцца за заказ для дарослых, чымся за дзіцячы асартымент. Выпушчаныя гэтай арцеллю сеткі для дзіцячых ложкаў кароткія і пакупнікам прыходзіцца прыточваць шпагат, а каштуе сетка 11 р. 90 к.

Вось побач на паліцы ў магазіне ляжаць дзве лялькі: адна прывезеная з Сімферопаля (прыгожая аддзелка, акуратная работа) і другая—выраб арцелі імя Крупскай (неахайная работа). Каштуе сімферопальская лялька 3 р. 25 к., а «наша» 6 р. 25 к.

Нашы абутковыя фабрыкі, прамысловыя арцелі, як правіла, выпускаюць дзіцячы абутак пачынаючы з 23 размеру для трохгадовых дзяцей. А што рабіць аднагадоваму, двухгадоваму? Такое-ж становішча і з верхняй вопраткай.

Менскі завод імя Молатава выпускае дзіцячую мэблю, але ён прадае не толькі пры ўмове, калі магазін забірае і «цяжкую» мэблю.

Безліч дзіцячых рэчаў, на яе ёсць вялікі попыт: карытцы, вазначкі, грабельцы, лапаткі, будаўнічыя скрынкі, пагрэмушкі, якія ўвозяцца з іншых гарадоў, могуць з вялікім поспехам быць выраблены на месцы.

Да апошняга часу паглядаюцца пагардлівыя адносіны нашых дзяржаўных прадпрыемстваў і прамысловых арцелей да выпуску дзіцячага асартыменту.

На многіх сходах, прысвечаных абмеркаванню новага законапраекту аб забароне абортаў, дапамозе рожаніцам, распырэнні сетак разільных дамоў, жанчыны-маціры выставілі зусім правільныя патрабаванні да нашых прамысловых і гандлюючых арганізацый — разгарнуць ва ўсю шырыню гандаль дзіцячым асартыментам.

Мы чакаем ад Наркаммясцпрома і кіраўніцтва промкаапераціі канкрэтнага адказу на закранутых намі пытаннях.

І. ТУРЭЦКІ.

У ЧЭРВЕНІ НЕ РЫХТУЮЦЦА ДА УБОРКІ

— З праполкай у нас не так ужо дрэнна,—сцвярджае загадчык чэрвеньскага райземаддзела тав. Собалеў. — Зводку ў Менск не падалі своечасова, вось і атрымалася нялобра.

Але справа не толькі ў зводках. Справа ў тым, што ў Чэрвеньскім раёне дрэнна арганізован догляд пасеваў.

Да апошніх дзён у раёне не зламаны шкодныя настроі, што «яшчэ няма чаго палоць», «яшчэ мала пустазелля». Калгас «Кастрычнік» лічыцца перадавым калгасам Грабёнскага сельсавета. А між тым толькі 28 мая тут вызначаны праполачныя звенні. Нормы выпрацоўкі не ўстаноўлены, не прыступілі да праполкі яравых пасеваў.

Палоць яравыя пасевы — тлумачыць нам старшыня калгаса Кудзін — цяпер выгады няма, яшчэ мала пустазелля, больш працадзён страціш, чым карысці атрымаеш.

На жаль, так разважаюць не ў адным толькі калгасе «Кастрычнік». У калгасе імя Кірава, Калодзецкага сельсавета, вызначаны 11 праполачных звенняў, але пачалі праполку толькі тры звяны, астатнія «кінуты ў запас».

Нічога дзіўнага няма пасля гэтага, што па 25 мая ў раёне праполата яравых збожжавых толькі 2,3 проц. Валевачоўскі і Даманавіцкі сельсоветы пачат не пачалі праполку яравых пасеваў.

Не намнога лепш становішча з праполкай насенных участкаў. Чым насенныя ўчасткі па сваіх папярэдніках, насенню, апрацоўцы і догляду адрозніваюцца ад звычайных пасеваў — у раёне не ведаюць, бо па гэты час больш чым ад паловы калгасаў нават не паступілі адпаведныя акты ў райземаддзел. А ў некаторых калгасах, як напрыклад, у калгасе імя Энгельса (старшыня калгаса Белы) насенныя ўчасткі проста не вызначаны.

Падкормліванне пасеваў ва многіх раёнах Беларусі прыняла масавы характар. У Чэрвені нічога цікавага пра гэта не могуць расказаць. Калгасная грамадскасць абсалютна не мабілізавана на правядзенне гэтага мерапрыемства барацьбы за высокі ўраджай.

У мінулым годзе вельмі многа калгасных свірнаў у раёне было заражана кляшчом. Між тым, ні адзін калгас у раёне не прыступіў да пабелкі, да дэзінфекцыі свірнаў, не падрыхтаваны дэзінфектуючыя матэрыялы.

СНК СССР і ЦК ВКП(б) у сваёй пастанове ад 19 снежня 1935 года аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў нячорназемнай паласы абавязалі да пачатку ўборкі ў кожным калгасе пабудаваць крытыя такі, гумны, сушыльні, каб уникнуць страты ўраджаю ў выпадку дажджлівага надвор'я.

У Чэрвені намечана да пачатку ўборкі пабудаваць 28 гумнаў, 10 крытых павецей, 12 зернасушылень сістэмы Уварава.

Але гэта толькі намечана. Па вестках райземаддзела гумнаў будуецца 12, зернасушылень 9, крытых павецей 5. Ніякага кантролю за ходам будаўніцтва няма. Старшыні калгасаў «Першамайск», «Вызваленне», імя Ільіча, Васько, Марціновіч і Грынкевіч па сутнасці адмовіліся будаваць зернасушылні, у многіх калгасах людзей з будаўнічых брыгад перакідваюць на іншую работу. У калгасе «Чырвоная Слабодка» для будаўніцтва гумна рацыяльі скарыстаць аграмаджаныя старыя будынкі. Іх разабралі. Старшыня калгаса Зыль незаконна раздаў гэтыя будынкі калгаснікам. Усе гэтыя факты ведаюць і ў райземаддзеле, але замест прыняцця мер тут бездапаможна разводзяць рукамі:

— Мы ўжо некалькі раз прапанавалі старшыням калгасаў разгарнуць будаўніцтва, але не слухаюць нас.

А тым часам ужо цэлы месяц, як старшыня калгаса імя Кірава, Калодзецкага сельсавета, абівае парогі райземаддзела. Калгасу абавязкова трэба будаваць два гумны. Трэба каб камісія з раёна выехала на месца і ўказала ўчастак, дзе будаваць. У райземаддзеле абяцаюць, у калгасе чакаюць, а будаўніцтва не пачынаецца.

Нават у тых калгасах, дзе па думцы раённых арганізацый будаўніцтва разгорнута, фактычна вывелі толькі сценкі і спынілі будаўніцтва. Асноўная прычына ў адсутнасці цвікоў і дахавага матэрыялу. Трэба падрыхтаваць гонт, дошкі, але ў калгасах з гэтым не спяшаюцца.

Адносна скарыстання мясцовых матэрыялаў ніхто не думае.

— Ці забяспечыце сканчэнне будаўніцтва да пачатку ўборачных работ?— пытаем у загадчыка райземаддзела.

— Думаю, што забяспечым.

Такой-жа думкі і тэхнік райземаддзела па будаўніцтву тав. Корзун. Але ён хістаецца, як толькі пачынаем разглядаць канкрэтныя лічбы і факты.

— Скажу я вам сумленна, што ніхто будаўніцтвам не кіруе, аб гэтым у нас мала хто гаворыць. Калі цяпер не будуць прыняты ўсе меры, будаўніцтва не скончым.

Нямала ў раёне і старых гумнаў, якімі калгасы карысталіся ў мінулым. Пакуль што гумны гэтыя, як і свірны і павеці, не рыхтуюцца, неачышчаны.

У райземаддзеле не могуць адказаць, колькі якіх уборачных машын патрабуюць рамонту, колькі адрамантавана. У сапраўднасці-ж да рамонту ўборачных машын калгасы не прыступілі, хоць са 103 конных жняярак 43 патрабуюць капітальнага рамонту.

Такое-ж становішча з рамонтам уборачных машын па МТС. МТС адставала ў часе веснавой сяўбы, нават не выканала свайго плана. Але з гэтага не зроблены адпаведныя вывады.

У чэрвені супакоіліся. На нарадах, якіх у раёне склікаецца не так ужо мала, людзі ўсё расказваюць аб тым, «як мы пасеялі». І толькі мехаходам, як аб вельмі далёкім, неактуальным успамінаюць аб уборачнай. Гэта прызнаюць і сакратар РК КП(б)Б тав. Касцюковіч і старшыня РВК тав. Дзейко. Але падрыхтоўка да ўборачнай ад гэтых прызнанняў не рушыцца з мёртвага пункту.

І. ШЛЯФЕР.

ГОРДЫЯ СОКАЛЫ НАШАЙ РАДЗІМЫ

РАСКАЗЫ АБ ГЕРОЯХ

ТАЛЕНАВІТЫ КАМАНДЗІР

Заданне было адказнае і цяжкое. Але Александр Александравіч Туржанскі ні мінуты не сумняваўся ў паспяховым выкананні яго. На чале буйнага падраздзялення ён адправіўся ў вялікі вучэбны пералёт. Недалёка ад Чорнага мора самалёты папалі ў паласу шторму. Машыны кідала ва ўсе бакі. Але Туржанскі не разгубіўся, ён павёў за сабой машыны, выбраўшы найбольш бязпасны маршрут. 200 кілометраў суханутныя самалёты ляцелі над адкрытым морам у абход шторму і ўдала прыбылі на месца прызначэння. Заданне было выканана.

Гераічнае жыццё камдзіва Туржанскага пачынаецца па сутнасці з 1918 года, калі ён, будучы яшчэ бязвусым юнаком, змагаецца ў радах чырвоных партызан супроць інтэрвентаў. Палкая нянавісць да ворага і любоў да сваёй радзімы выхавалі ў ім непахіснага байца, рашучага і адважнага салдата рэволюцыі. З партызанскага атрада тав. Туржанскі пераходзіць добраахвотнікам у рады Чырвонай арміі. У 1919 годзе ён прымаў удзел у баявых аперацыях па абароне Царыцына, а ў 1920 годзе на паўднёва-заходнім фронце змагаўся з белапалякамі. У 1920 годзе яго паслалі ў авіяшколу. З таго часу ён стаў лётчыкам.

Упартая работа па аўладанню тэхнікай лётнай справы хутка высунула яго ў рады таленавітых камандзіраў. Усе свае веды, увесь вопыт тав. Туржанскі перадае лётчыкам сваёй часці. Пад яго кіраўніцтвам, следуючы яго асабістаму прыкладу, лётчыкі паспяхова авалодваюць тэхнікай лётнай справы. Спалучаючы пры гэтым высокія тэмпы з бліскучай якасцю баявой падрыхтоўкі. Падраздзяленні часці тав. Туржанскага на працягу апошніх год не ведаюць ніякіх лётных «здарэнняў». Часць тав. Туржанскага — гэта выхаваная і навучаная ім дружная, дысцыплінаваная сям'я совецкіх патрыётаў, выдатных герояў нашай радзімы, якія па-майстэрску ўладаюць паветраным відам абароны.

Недарма ў 1934 годзе за асоба выдатныя заслугі ў справе баявой падрыхтоўкі авіячасцей тав. Туржанскі атрымаў узнагароду — ордэн «Красная звезда», а цяпер па пастанове Урада ўзнагароджан ордэнам Леніна.

СЁСТРЫ КАЗАРЫНАВЫ

Варочаючыся з чарговага палёту, Тамара Казарынава на вышыні 400 метраў заўважыла, што ў самалёце аварвалася і павісла ножка шасі. Што рабіць? Пасадка ў такіх выпадках пагражае аварыяй. Бортмеханік прапанаваў свае паслугі: «Дазвольце, тав. камандзір, вылезці на плоскасць і паправіць калясо». Але Казарынава не дазволіла. У яе руках машына пакорна выконвае ўсе загады. Яна хутка прыняла рашэнне выключыўшы матор, пайшла на пасадку. Дакладна разлічыўшы, Казарынава зрабіла пасадку, сеўшы на адно калясо і нават не падрапаўшы машыны.

Скромная і адважная Казарынава неахвотна расказвае аб сваіх гераічных учынках:

«Ну што-ж тут асаблівага?..»

Лётчыца Казарынава — адважная і дастойная дачка сваёй радзімы — нарадзілася ў 1906 годзе. Застаўшыся з дзяцінства без бацькі, яна рана пачала самастойна працаваць. У 1929 годзе, працуючы на піонерскай рабоце на заводзе «Дынамо» ў Маскве, яна загарэлася любоўю да лётнай справы. У 1931 годзе яна паспяхова скончыла авіяшколу і стала лётчыкам, а праз кароткі час і камандзірам звяна.

За выдатнае аўладанне тэорыяй лётнага палёту тав. Казарынава атрымала каштоўную ўзнагароду ад камандавання ваеннай акругі. Яна паспяхова ўдасканальвае свае веды і перадае іх сваім падначаленым, умела рыхтуючы з іх стаханаўцаў паветранага флота. Ордэн Леніна — заслужаная ўзнагарода за 6 год безаварыйнага палёту, за выдатныя поспехі ў аўладанні лётнай справай. Казарынава не толькі выдатны лётчык, яна ўпарта павышае сваю палітычную і агульнаадукацыйную падрыхтоўку.

У Тамары Казарынавай ёсць маладшая сястра — Міла. Яна таксама лётчыца.

***

Такія гордыя сокалы нашай краіны, выхаваныя вялікай партыяй Леніна—Сталіна. У нашай краіне кожны імкнецца і можа стаць героем. У будучых баях з ворагам сваю выдатную сацыялістычную радзіму будзе па-геройску абараняць увесь совецкі народ.

Д. РАМАНОЎСКІ.

МАЙСТАР ВЫШЫНЬ

Старшы лейтэнант Владзімір Шэўчэнка скупы на словы. Тое, што ён зрабіў, лічыць недастатковым. У яго шмат планаў на будучае. Асноўнае — асваенне стратасферы для працяжных палётаў на самалёце.

Па прыходзе на завод імя Авіяхіма Вл. Шэўчэнка пачаў работу над праблемай палётаў у стратасферу на планеры і самалёце. Ён упершыню ў свеце пачаў практычную распрацоўку ідэі стратасферных палётаў на двухмесным самалёце з маторам вадзянога ахалоджання. У гэтым яму дапамагаў яго прыяцель—прараб самалёта інж. П. Н. Носікаў.

У першым вышынным палёце ў Вл. Шэўчэнка перастаў працаваць кіслародны прыбор. Самалёт знаходзіўся на вышыні 9 тысяч 500 метраў. Пілот страціў прытомнасць. Шэўчэнка прышоў у сябе, калі ўжо быў на вышыні 1.000 метраў. Ён зараз-жа схапіўся за руль, вывеў машыну з беспарадачнага падзення і прадаўжаў палёт па заданню. Заданне было выканана.

Першы пробны палёт на 2-месным самалёце з маторам вадзянога ахалоджання Шэўчэнка зрабіў у той-жа дзень, калі Кокінакі ажыццявіў рэкордны палёт на 14 тысяч 575 метраў. Неўзабаве 8 сакавіка Шэўчэнка ўжо дасягнуў вышыні ў 11 тысяч метраў. Хутка набраўшы гэту вышыню, ён 20 мінут ляцеў на прэдзельнай вышыні. Перыстый воблакі ў стратасферы, якія злаюцца ажурнымі з зямлі, уяўлялі сабою шчыльную заслону, якая закрывала зямлю.

Калі Шэўчэнка прабіў воблакі, ён выявіў, што знаходзіцца над Загорскам. Не выключаючы матор, ён пашоў назад, у Маскву, на цэнтральны аэрадром. Гаручага было даволі, каб прадаўжаць палёт.

7 мая Вл. Шэўчэнка ўнёс папраўку ў свой рэкорд. У гэты дзень ён дасягнуў 11.100 метраў.

АЛ. ГУДКОЎ.

(«Н. З.»).

Узнагароджаны ордэнам вядомы лётчык-выпрабавальнік тав. В. В. Шэўчэнка.



Лётчыкі ваенна-паветраных сіл РСЧА, якія ўрадам Саюза ССР узнагароджаны ордэнамі (злева направа): верхні рад — тт. Птухін Е. С., Гусеў А. Г.; Серэнка А. І.; ніжні рад—т.т. Фамін Ф. І., Кузнецоў П. Н., Літвінаў Б. І.

МУЖНАСЦЬ І АДВАГА

Вышынямер самалёта паказвае 1.500. Частка баявога задання — стральба па конусу — выканана. Наперадзе — пілатаж. Ледзь камандзір тав. Фамін прыступіў да выканання другой часткі задання, як раптам раздаўся ўзрыў. Узарвалася ракета, якая ўпала пад бензінавы бак. Катастрофа — немінуча.

У такіх выпадках у першую чаргу неабходна вытрыманасць, цвёрдасць і самаўладанне. Гэтымі якасцямі поўнасцю ўладаў капітан Фамін. Ніколькі не разгубіўшыся, ён адразу-ж набірае патрэбную вышыню і свабоднай левай рукой прабуе дастаць гарэлую ракету, але беспаспяхова. Застаюцца два варыянты: кінуць машыну і самому выратавацца на парашуце, або з рызыкай для жыцця вычакаць працэс гарэння — 35—40 секунд. Тав. Фамін адважваецца на другое. Ракета згарала, не дасягнуўшы сваім агнём бака. Машына выратавана. Цвёрдасць, вытрыманасць, самаўладанне, мужнасць.

Не забыць тав. Фаміну і другога выпадку. Яшчэ малодшым камандзірам, знаходзячыся ў маршрутным палёце, тав. Фамін нечакана адчуў рэзкі штуршок. Прабіт картэр. Матор спыніў дзейнічаць. Застаецца выцуканая пасадка. Не глядзячы на незнаёмую мясцовасць, Фамін не губляецца і ўдала робіць пасадку. Веданне машыны, уменне пілатаваць ёю пры ўсякіх складаных умовах— вось што характэрна для былога малодшага камандзіра, а цяпер капітана Ф. І. Фаміна.

Капітан Фамін — узор умелага выхавацеля маладых камандзіраў-лётчыкаў. Камандзіры тт. Еременка, Нікулін, Карманаў, Каласкоў, Астахаў, Саўкін і інш. — гэта ўсё яго былыя вучні, якія сёння выдатна аўладалі, як і іх настаўнік, лётнай справай.

Падраздзяленне капітана Фаміна не ведае аварый. У зэліках па баявой і палітычнай падрыхтоўцы значацца адзнакі: «добра» і «выдатна».

Капітан Фамін, былы качагар чыгункі, сын калгасніка-конюха калгаса імя 15-годдзя Кастрычніка, Іванаўскай вобласці, спяшаецца падзяліцца з бацькам Іванам Сцяпанавічам сваёй вялікай радасцю з прычыны ўзнагароды яго ордэнам «Красная звезда»:

«Дарагі бацька, — піша ён яму, — сёння я давядаўся, што ў ліку лётчыкаў РСЧА, якія атрымалі высокую ўрадавую ўзнагароду, знаходжуся і я. Гэта знамянальны дзень для мяне і для ўсёй нашай сям'і. Я ганаруся тым, што апраўдаў давер е працоўных нашай краіны. Сёння ў адказ на маю ўзнагароду я разам з усім сваім падраздзяленнем абавязаўся, што будзем яшчэ больш упарта працаваць і вучыцца, каб заняць па баявой і палітычнай вучобе пярэдняе ў часці. Ты можаш спакойна працягваць сваю мірную працу ў калгасе. Твой сын і надалей будзе ахоўваць вашу мірную працу і ў патрэбную мінуту сваімі грудзьмі абароніць нашу горача любімую радзіму ад яе ворагаў. Прывітанне калгаснікам-аднасяльчанам.

Ваш сын капітан-ордэнаносец Фамін».

***

Сярод узнагароджаных ордэнам «Красная звезда» значыцца таксама прозвішча маёра Е. М. Белецкага. Маёр Белецкі ўвасабляе сабой выдатнага камандзіра. Яго часць не ведае іншых адзнак як толькі выдатна. Аварыям і паломкам месца няма. Маёр Белецкі падрыхтаваў вялікую колькасць камандзіраў-лётчыкаў, якім зараз прысвоены званні лейтэнантаў, капітанаў і нават маёраў.

Маёр Белецкі мае 30 узнагарод, у тым ліку імянны залаты гадзіннік ад народнага камісара абароны СССР, маршала Совецкага Саюза тав. Варашылава, пачэсную грамату ад камандарма 2-га ранга Алексніса, і занесены на пачэсную дошку ваеннай акругі. 1.700 лётных гадзін мае маёр Белецкі за 9 год сваёй узорнай службы ў радах ваенна-паветраных сіл РСЧА. Ён няспынна працуе над павышэннем сваіх ведаў, за 2 гады ўпартай вучобы аўладаў англійскай мовай і зараз працягвае яе вывучаць.

Такі непартыйны большэвік — маёр Белецкі.

С. АРКАДЗЬЕЎ
М. ГЕЛЬФАНД.

„ПАВЕТРАНЫ ПЕШАХОД"

«Паветраны пешаход». Так завуць Харахонава ў часці. І гэта некалькі незвычайнае імя ён у поўнай меры заслужыў. Толькі тры гады назад упершыню пазнаёміўся Харахонаў з парашутызмам, а к сённяшняму дню ён зрабіў без малога трыста прыжкоў.

Ды якіх прыжкоў! Ён прыгаў адзін і прыгаў разам з таварышам. Ён прыгаў на штопару і прыгаў ноччу, калі самалёт рабіў чацверты віток. Яму належыць ініцыятыва адначасовага прыжка ўсяго самалётнага экіпажа. Ён-жа першы паказаў, як, карыстаючыся парашутам, можна дапамагчы раненаму ў баі.

Але такая-ж, відаць, уласцівасць парашутызма — спорту адважнага і гераічнага, што, раз датыкнуўшыся з ім, чалавек ніколі не пакіне парашута і, чым больш будзе прыгаць, тым больш будзе ўскладняць прыжкі. На ўсесаюзнай нарадзе стаханаўцаў авіяцыі Харахонаў з усмешкай расказаў дэлегатам сваю вялікую мару:

— Мне хочацца, таварышы, навучыцца прыгаць з парашутам, маючы пры сабе веласіпед. Уявіце: парашутыст прызямліўся, і да месца прызначэння яму трэба далёка ісці. Ці-ж дрэнна, калі ён, вызваліўшыся ад парашута, сядзе на веласіпед і хутка прыбудзе куды трэба.

Мінула некалькі месяцаў, і мара паступова становіцца яўю. Вопыты Харахонава ўвенчваюцца поспехам.

Экспертыментуючы і трэніруючыся, «паветраны пешаход» адначасова шмат сіл і энергіі аддае падрыхтоўцы новых кадраў. Звыш поўтысячы маладых парашутыстаў, каля ста спартсменаў і інструктароў — вось падарунак Харахонава сваёй радзіме, падарунак, годны высокай ацэнкі,— Харахонаў узнагароджан ордэнам Леніна.

СТ. КАСТРОЎ.

(«К.З.»)

Узнагароджаная ордэнам лётчыца тав. Т. А. Казарынава.

ЛЕТЧЫКІ-ОРДЭНАНОСЦЫ

Камбрыг Птухін параўнаўча малады чалавек. Яго год нараджэння—1900.

У 1918 годзе тав. Птухін юнаком добраахвотна ідзе ў Чырвоную армію. У гэтым-жа годзе ён уступае ў ВКП(б). З першага-ж дня прабывання ў Чырвонай арміі Птухін пападае ў авіяатрад матарыстам. Ён наладжваў недабітыя «Фарманы», «Ньюпоры» і «лятаючыя галошы» іншых сістэм, на якіх адважныя чырвоныя пілоты ўсё-ж не раз білі лётчыкаў Дзенікіна, белапалякаў і іншых інтэрвентаў.

Лёс Еўгенія Савельевіча Птухіна моцна звязаўся з авіяцыяй. Ён палюбіў яе ад усёй душы і рашыў прысвяціць гэтай справе сваё жыццё. Пасля грамадзянскай вайны ён паступае ў школу лётчыкаў-бамбардзіроўшчыкаў і паспяхова заканчвае яе ў 1924 годзе. Працаваў пасля гэтага лётчыкам, старшым лётчыкам, камандзірам падраздзялення. І вось сёння мы бачым яго камбрыгам.

За час сваёй работы ў авіяцыі тав. Птухін выхаваў нямала адважных лётчыкаў. У спісе ўзнагароджаных урадам Саюза ССР лётчыкаў ваенна-паветраных сіл РСЧА каля 20 чалавек, выхаваных камбрыгам Птухіным. Тыя часці, якімі ён камандаваў, былі безаварыйнымі часцямі, з выдатнай баявой і тэхнічнай падрыхтоўкай.

Урад па заслугах ацаніў работу камбрыга Птухіна, узнагарадзіўшы яго ордэнам «Красная звезда».

***

Лётчык, камандзір падраздзялення А. І. Серэнка нарадзіўся ў 1908 годзе на станцыі Камышын, Сталінградскага края, у сям'і чыгуначніка. Па сканчэнні школы ФЗВ вышаў токарам па металу.

У 1928 годзе ён паступіў у авіяшколу, потым вучыўся ў школе лётчыкаў-знішчальнікаў. Закончыў абедзве школы на выдатна. Пасля гэтага тав. Серэнка з кожным днём удасканальваў свае веды, набіраўся вопыту і рос. Узнагароджанне ордэнам «Красной звезды» застала яго на пасадзе камандзіра падраздзялення.

Свой багаты вопыт лётчык Серэнка перадае маладым лётчыкам, усе свае намаганні прыкладвае да таго, каб выхаваць з іх выдатных совецкіх пілотаў. За 5 год работы ў авіяцыі на камандных пасадах тав. Серэнка навучыў лётнаму майстэрству 50 чалавек. Ніколі ў яго падраздзяленні не было аварый або якіх-небудзь паломак. За тав. Серэнка цвёрда замацавалася высокая годнасць безаварыйнага лётчыка і выдатнага выхавацеля.

***

Біяграфія капітана В. Г. Зайцэва, які таксама ўзнагароджан ордэнам «Красная звезда», мала чым адрозніваецца ад біяграфіі тав. Серэнка. Ён таксама нарадзіўся ў 1908 годзе, ён таксама выхаванец совецкай краіны, верны і адважны сын сваёй сацыялістычнай радзімы.

Капітан Зайцэў камандуе падраздзяленнем, якое з'яўляецца безаварыйным і ўсе заданні выконвае не менш, як на добра, няхай гэта палёт, або паветраны бой.

Тав. Зайцэў выхаваў шмат выдатных лётчыкаў. У яго падраздзяленні праходзіў баявую вучобу вядомы лётчык тав. Супрун, якога ўрад узнагарадзіў ордэнам Леніна.

***

Вышэйшую ўзнагароду Саюза — ордэн Леніна — атрымаў маёр Н. І. Толакаў. Толакаў — стары безаварыйны лётчык, удзельнік Паўднёвага і Каўказскага фронтаў грамадзянскай вайны.

За сваю службу ў ваеннай авіяцыі маёр Толакаў надлётаў 1.700 гадзін, зрабіў 900 пасадак і не было ніводнага выпадку, каб яго самалёт пацярпеў аварыю або якую-небудзь паломку.

Інспектарскае заключэнне аб маёру Толакаве і яго падраздзяленні кажа: «Усе задачы выконваюцца добра, аварый няма. Лётны склад падрыхтован па тэхніцы пілатажу вельмі добра». Гэта ацэнка ў поўнай меры заслужана.

П. ПЯТРОЎСКІ.

АГЛЯД ДРУКУ

ПРАЙШЛО БОЛЬШ ТРОХ МЕСЯЦАЎ...

Надрукаваўшы 14 лютага пастанову ЦК КП(б)Б аб культасветнай рабоце ў вёсцы, мазырская акруговая газета «Большэвік Палесся» два тыдні нічога не пісала па пытаннях культуры. Толькі 5 сакавіка газета змясціла дзве заметкі, у якіх адзначыла, што ў калгасе «Чырвоная ніва», Жыткавіцкага раёна, і калгасе «Перамога», Лельчыцкага раёна, ніякай культурнай работы не праводзіцца.

Пасля гэтай інфармацыі газета зрабіла зноў перапынак на цэлую дэкаду. 15 сакавіка на старонках газеты з'явілася маленькая заметка пад загалоўкам «Лікпункт не працуе». Праз 8 дзён чытач зноў убачыў у мазырскай газеце загаловак «Культработа не праводзіцца».

Толькі 10 красавіка «Большэвік Палесся» ўпершыню ўзняў на сваіх старонках пытанне аб рэалізацыі пастановы ЦК КП(б)Б. Змешчана караспандэнцыя «Не выконваюць пастановы партыі». Але ў сваёй крытыцы газета вышэй сельсавета не ўзнялася. Па думцы газеты, дрэнная работа ўсіх 16 дамоў культуры ў Даманавіцкім раёне «тлумачыцца тым, што рад сельсоветаў раёна не зварачаюць увагі на выкананне пастановы партыі аб культурнай рабоце на вёсцы».

А дзе-ж раённае кіраўніцтва? Што робяць Даманавіцкі РК КП(б)Б і РВК?

Вычарпаўшы ўсе варыянты здмоўных загалоўкаў на культурныя тэмы, газета парашыла больш не паўтарацца і таму 15 красавіка толькі напомніла: «Яшчэ раз аб культурнай рабоце ў вёсцы». Потым, як відаць, газеце проста надаела займацца гульнёй у загалоўкі і яна зусім спыніла пісаць на культурныя тэмы. Больш месяца ўжо як на старонках «Большэвіка Палесся» чытач не бачыць ні аднаго радка па пытаннях культуры.

***

Горацкая раённая газета «Ленінскі шлях» часта змяшчае адзел «На культурныя тэмы». Пісала газета аб гэтым раней, да пастановы ЦК КП(б)Б аб культурна-асветнай рабоце на вёсцы, піша і зараз. Але няма ніякай перамены ў характары пастаноўкі пытанняў культасветнай работы.

Безліч караспандэнцый з месц сведчаць аб тым, што культмасавая работа ў раёне пастаўлена дрэнна. Газета абмяжоўваецца адной інфармацыяй, не робіць ніякіх вываў.

У 70 нумары газеты змешчана заметка пад загалоўкам «Няма работы лікпунктаў».

«Настаўніца Багданоўская не жадае арганізаваць работу лікпункта ў калгасе імя Куйбышэва. Між тым ёсць шмат непісьменных і малапісьменных калгаснікаў».

Падобных заметак у газеце мноства. Усе яны напісаны па аднаму шаблону: абвінавачваюць у адсутнасці той ці іншай работы настаўніка, старшыню калгаса, сельсавета. І кожны раз газета заяўляе, што вінаваты «не жадае», або «не цікавіцца работай», і на гэтым абмяжоўваецца.

Газета не ўзнімае пытання на прынцыповую вышыню, а нудна з дня ў дзень паведамляе адны і тыя-ж факты, не імкнучыся іх абагуліць і зрабіць патрэбныя вывады.

***

Своеасабліва перабудоўвае сваю работу і менская раённая газета «Шлях сацыялізма» пасля рашэння ЦК КП(б)Б аб культмасавай рабоце.

Пастанова змешчана. А як яна рэалізуецца? Гэта, як відаць, менш за ўсё цікавіць газету. Час-ад-часу газета інфармуе, што той чырвоны куток працуе добра, а вось гэты на замку.

Вельмі абмяжоўвае газета культурныя запросы калгаснікаў. У нумары 28-ж змешчана заметка, дзе сказана:

«Клуб калгаса «Чырвоная зорка» з'яўляецца цэнтрам культурнага адпачынку калгаснікаў».

Гэта правільна. Але ў чым выражаецца культурны адпачынак калгаснікаў? Аказваецца ў тым, што «закуплена гармонь і вечарам кожную суботу і нядзелю наладжваюцца танцы».

У нумары за 8 сакавіка паказана культбытавая канферэнцыя ў Астрашыцкім гарадку. Змешчаны цікавыя выступленні санінспектароў, старшынь калгасаў. Каштоўную думку выказаў тав. Агейчык, санінспектар калгаса «Прамень сацыялізма»:

«Усе гаварылі аб культуры і чыстаце ў хаце калгасніка, але нам патрэбна паклапаціцца і аб культуры рабочага месца. Як можна працаваць па-стаханаўску на канюшні або на ферме, калі там будзе грязі па калена?»

Канферэнцыя намеціла рад канкратных мерапрыемстваў, але газета не паказвае, як яны праводзяцца ў жыццё.

***

Нядаўна бюро ЦК КП(б)Б вынесла спецыяльную пастанову аб ходзе выканання рашэння СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 16 студзеня гэтага года аб навучанні непісьменных і малапісьменных. ЦК КП(б)Б папярэдзіў сакратароў акругкомаў, гаркомаў і райкомаў, што асабіста яны нясуць адказнасць за выкананне дырэктывы ЦК аб ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці. Гэта папярэджанне ў роўнай меры адносіцца і да акруговых і раённых газет.

Комсамолка-звеннявая (калгас імя Вэрашылава, Касум-Ізмаілаўскага раёна, Азербайджан) тав. М. Керымава, якая ўзнагароджана ордэнам «Знак почета», арганізавала ў калгасе гурток варашылаўскіх стралкоў, у якім сістэматычна займаюцца пяць дзяўчат. НА ЗДЫМКУ: група варашылаўскіх стралкоў. На першым плане арганізатар гуртка ордэнаноска Керымава.

Фото Шэўцова (Саюзфото).

СПІРТ З ГНІЛОЙ ДРАЎІНЫ

Па падліках гомельскага навукова-даследчага інстытута лясной гаспадаркі, у рэспубліцы кожныя пяць год гніе на 60 млн. руб. драўніны, якая знішчаецца лясными шкоднікамі—грыбком і жучком. Адзін толькі грыбок «сасновая губка» наносіць страты ў 30 млн. руб. Драўніна, якая знішчаецца грыбком, звычайна гніе, не выкарыстоўваецца і стварае ў лясах ачагі лясных шкоднікаў.

Лесахімічная лабараторыя інстытута ўпершыню правяла дослед гідроліза гнілой драўніны, які бліскуча ўдаўся. Гнілая драўніна аказалася добрай крыніцай для атрымання віннага спірту.

ЗНІЖЭННЕ ЦЭН НА РАННЮЮ ГАРОДНІНУ

З 1 чэрвеня ў Менску, Віцебску і Гомелі зніжаны цэны на раннюю гародніну: на радыс і зялёную цыбулю — на 10 кап. за кілограм, на гуркі — на 70 кап., на укроп у пучках — на 2 р. 50 кап., на пятрушку—па 80 кап. за кілограм.

ЯКОЕ ЧАКАЕЦЦА НАДВОР'Е

Пасля сухога надвор'я ў канцы мая па ўсёй БССР прайшлі дажджы. 27 мая ў Полацку выпала 4 міліметры ападкаў, Оршы, Менску і Васілевічах — 7 міліметраў. Колькасць выпаўшых ападкаў 29 мая яшчэ большая. У Оршы выпала ападкаў 17 міліметраў, Барысаве — 12, Жыткавічах — 10, Асіпавічах— 8 міліметраў.

Услед за прайшоўшымі дажджамі значна знізілася тэмпература. У Полацку тэрмометр ноччу 30 мая паказаў 0 градусаў, у цэнтральных раёнах — 2—3 градусы цеплыні, на поўдні — 6 градусаў цеплыні. Гэта пахаладанне было выклікана перамяшчэннем халоднага паветра з Поўначы і Паўночнага захаду на Поўдзень і Паўднёвы ўсход. Але пахаладанне пратрымалася нядоўга. Ужо 31 мая ноччу ў Полацку тэрмометр паказаў 6 градусаў цеплыні, у цэнтральных раёнах — 7—8 градусаў, на поўдні 8—10 градусаў.

Па даных Інстытута доўгатэрміновых прагнозаў у чэрвені месяцы чакаецца наступнае надвор'е:

У пачатку перыяда з 1 па 6 чэрвеня пераважна воблачнае дажджлівае надвор'е з паслядоўным памяншэннем воблачнасці да поўнага праяснення ў канцы перыяда. Хістанне тэмпературы — ад 12 да 19 градусаў.

З 7 па 13 чэрвеня пераважна воблачнае надвор'е, часамі дажджы са шкваламі, спынение ападкаў, паслабленне вятроў у канцы перыяда. Хістанне тэмпературы — ад 12 да 20 градусаў.

У перыяд з 14 па 22 чэрвеня пераважна воблачнае надвор'е, часамі дажджы. Вятры ад умераных да слабых. Хістанне тэмпературы — ад 15 да 20 градусаў.

У пачатку перыяда з 23 па 30 чэрвеня пераважна яснае надвор'е з паслядоўным павелічэннем воблачнасці, ападкі. Вятры ад умераных да свежых. Хістанне тэмпературы — ад 14 да 20 градусаў.

***

Прайшоўшыя па ўсёй БССР дажджы і цёплае надвор'е спрыяе росту азімых і яравых. На поўдні (Васілевічы, Мазыр, Камарын) жыта пачынае красаваць. У Марына-Горках і Любані таксама часткова пачынаецца красаванне жыта. У паўночных раёнах жыта калаесіцца. Пасевы ў сярэднім і ў добрым становішчы.

У Марына-Горках, Лельчыцах і Асіпавічах пачынае каласіцца пшаніца. На поўначы пшаніца выходзіць у трубку.

Пасля дажджу асабліва палепшыліся яравыя пасевы. Усюды пачынае ўсходзіць бульба. Яравыя зерновыя на поўдні вышлі ў трубку.

ГАРОДНЯЯ СОЎГАСЫ БССР ЗАНЯЛІ ПЕРШАЕ МЕСЦА

У студзені-маі адбываліся рэспубліканскія і краявыя алімпіяды мастацкай самадзейнасці рабочых гародных соўгасаў. У БССР алімпіяда адбывалася з 11 па 13 красавіка г. г. ЦК профсаюза рабочых гародных соўгасаў падводзіў вынікі праведзеных алімпіяд і адзначыў, што першае месца занялі сярод іншых краёў і абласцей гародныя соўгасы БССР. Грашыма і каштоўнымі падарункамі прэміраваны калектывы мастацкай самадзейнасці соўгасаў «Чырвоны транспартнік», Менскага раёна, і імя Розенгольца, Магілеўскага раёна, а таксама асобныя ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці.

УКЛЮЧЫЛІСЯ Ў ГРАМАДСКУЮ РАБОТУ

Жонкі кіруючых работнікаў Гарадоцкай МТС Аўдзейчыкава, Сафонава і іншыя ўзяліся азеляніць цэхі матышнатрактарнай майстэрні. Яны таксама прыводзяць у культурны выгляд памяшканне МТС. У памяшканнях кааперацыйных устаноў, дзякуючы жонкам работнікаў райспажыўсаюза і прылаўка, пачалі з'яўляцца кветкі. Чырвоны куток, які раней быў у антысанітарным становішчы, прыведзен у парадак.

У лестрангсае жонкі кіруючых работнікаў Шувалава, Ракуц, Канькова і інш. зрабілі некалькі выездаў на лесаўчасткі, у інтэрнаты рабочых.

З. ДОКТАРАЎ, Ф. ЛЯЎЧОНАК.

3-ЦІ МІЖНАРОДНЫ ШАХМАТНЫ ТУРНІР У МАСКВЕ

МАСКВА, 31 мая. (БЕЛТА). 31 мая на трэцім маскоўскім міжнародным шахматным турніры дагіграваліся адкладзеныя раней партыі.

Румін, не аднаўляючы ігры, здаў **Батвініку** сваю безнадзейную партыю.

Ліліенталь хутка пераканаўся ў негрунтоўнасці ігры на выйгрыш супроць **Батвініка** і згадзіўся на нічыю.

Нечакана закончылася сустрэча **Рагозін — Кан, у якой Кан** меў лішнюю праходную пешку. Здавалася, што паражэнне Рагозіна неміну́ча. Аднак, чэмпіён Ленінграда дасціпнымі хадамі фарсавана дабіўся нічыёй.

Іграўшы белымі **Флор** не здолеў скарыстаць сваю лішнюю праходную пешку ў ладзейным эндшпілі супроць **Рагозіна**. Рагозін іграў вельмі дакладна, і гэта партыя таксама закончылася ўнічыю.

Пасля 13 тураў Капабланка мае 9.5 ачкоў, Батвінік — 8, Рагозін і Ліліенталь — па 6.5. Ласкер, Левенфіш, Кан, Флор і Эліскасес — па 6 і Румін 4.5.

2 чэрвеня, у 14 туры, сустрэнуцца: Флор — Ласкер, Капабланка — Левенфіш, Румін — Рагозін, Кан—Батвінік і Эліскасес — Ліліенталь.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ ГЕАЛАГІЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

У Менску адбылася ўсебеларуская геалагічная канферэнцыя, скліканая Наркаматам мясцовай прамысловасці і Акадэміяй навук БССР. У яе рабоце прымалі ўдзел інжынеры-геолагі, гідрагеолагі, начальнікі вышукальных партый, буравыя майстры. Уступнае слова сказаў прэзідэнт Акадэміі навук БССР акад. Сурта. З дакладамі аб упарадкаванні геалагічнай справы ў БССР і аб нормах выпрацоўкі і аплаты працы на геолага-разведачных работах выступілі праф. Шпенцэр і нам. дырэктара Інстытута геалогіі Акадэміі навук тав. Зуеў.

БССР праароблена значная работа па вывучэнню прыродных багаццяў рэспублікі і геалагічнай будовы яе глеб. З тэрыторыі БССР у 126 тысяч квадратных кіламетраў пакрыта геалагічнай з'ёмкай розных маштабаў 103 тысячы квадратных кіламетраў.

У рэзультаце работы шматлікіх навуковых геалагічных экспедыцый і вышукальных партый створана моцная сыравінная база для буйных заводаў будаўнічых матэрыялаў, у тым ліку для крычаўскага цэментнага завода і Лоеўскага завода фарбаў. На тэрыторыі БССР знойдзена вялікая колькасць шкляных пяскоў, агнетрывалых глін, фасфарытаў, даламітаў, што адкрывае перспектывы для пабудовы новых шкляных заводаў, заводаў будаўнічых матэрыялаў, для вытворчасці мінеральных угнаенняў і т. д.

Канферэнцыя выказалася за неабходнасць стварэння пры Наркамаце мясцовай прамысловасці горнага нагляду і геолагаразведачнай групы. Распрацаваны нормы прадукцыйнасці і расцэнкі на геолагаразведачных работах, а таксама вызначаны мерапрыемствы, якія забяспечваюць развіццё стаханаўскага руху на гэтых работах.

Канферэнцыя паслала прывітальную тэлеграму тав. Гікало і тав. Галадзеду.

ЯК НАГЛЯДАЦЬ СОНЕЧНАЕ ЗАЦМЕНЕНЕ

Сонечнае зацменне, якое адбудзецца 19 чэрвеня г. г., будзе наглядацца ў Менску як частковае. Толькі каля трох чвэртак сонечнага дыску ў момант найбольшай фазы (7 гадзін 13 мінут) будуць зацменены. Астатняя частка будзе свяціць настолькі ярка, што наглядаць зацменне простым (неўзброеным) вокам будзе немагчыма і небяспечна, бо пры гэтым можна пашкодзіць сабе зрок. Неабходна падрыхтаваць кавалак аконнага шкла (15 на 10 сантыметраў), закопчанага з аднаго боку. Яшчэ лепш склеіць два кавалкі разам закопчаным бокам у сярэдзіну, абклеіўшы краі паперай. Масавым вырабам такіх шкелак для продажу павінна была-б заняцца прамысловая кааперацыя.

Праф. А. КАЙГАРАДАЎ.



Менскія машынабудаўнічыя заводы арганізавалі вытворчасць канавакапальнікаў, якія ўпершыню выпрацоўваюцца ў БССР. Канавакапальнік сканструяван на менскай станцыі механізацыі сельскай гаспадаркі і прызначан для меліярацыйных работ. Амерыканскі канавакапальнік дае ў два праходы максімальную глыбіню ў 0,6 метра і на задзіраянелых месцах працаваць не можа. Совецкі-ж канавакапальнік дае ў два праходы глыбіню ў 0,85 метра і лёгка працуе на задзіраянелых участках. НА ЗДЫМКУ: канавакапальнік менскай станцыі механізацыі сельскай гаспадаркі.

Фото ЛІЛІНА.

КІНО

„ЦЫРК"

(Новая карціна вытворчасці студыі Мосфільм 1936 г.)

У совецкай краіне няма месца нацыянальнай розні. Усе працоўныя, незалежна ад колеру скуры і якіх-небудзь іншых расавых адзнак, з'яўляюцца поўнапраўнымі грамадзянамі сваёй социялістычнай радзімы. Інтэрнацыянальная салідарнасць — вось асноўная ідэя новай кінакамедыі «Цырк».

Амерыканская цыркавая артыстка Марыон Дыксон (артыстка Орлова) у адным амерыканскім гарадку ўцякае ад раз'юшанага натоўпу «цывілізаваных» дзікуноў, якія даведаліся, што ў Марыон чорнае дзіця ад негра. Артыстка ўязджае ў Совецкі Саюз. Яна не ведае, што ў краіне Совецкіх няма месца расавай розні і старанна ўтойвае, што ў яе чорнае дзіця. Ёй падабаецца Масква. Яна закахалася ў маладога совецкага цыркавога артыста Мартынава і гатова застацца ў Совецкім Саюзе.

Гэтага не можа сцярпець яе партнёр немец Кнейшып. У перапоўненым публікай цырку ён громка абвяшчае, што ў Марыон дзіця ад негра.

У краіне Дыксон, у краіне Кнейшыца гэта выклікала-б ярасць, выбух абурэння, свісткі, але публіка маўчыць. Кнейшып зноў паўтарае сваё «сенсацыйнае» паведамленне, але яго сустракае дружны смех. Над ім смяюцца, яго з абурэннем асвістваюць. Увесь цырк песціць дзіцё, яго любоўна перадаюць з рук у рукі. Рабочыя, работніцы, служачыя, чырвонафлотцы, — людзі совецкага народу—на сваіх нацыянальных мовах спяваюць калыханку негрыцёнку.

У зале грымяць апладысменты 1, здаецца, усе спяваюць разам з экранам. Інтэрнацыянальная салідарнасць — цудоўнейшая якасць вялікага совецкага народу.

Рэжысёр Г. Александраў — пастаноўшчык «Вясёлых рэбят» — добра паставіў новую карціну. І сама пастаноўка і ігра артыстаў, у асаблівасці добра знаёмай нашаму глядачу артысткі Орловай, даюць адчуваць, што людзі, якія тварылі карціну, працавалі над гэтым любоўна і старанна. Па сваёму зместу, па сваёй ідэйнай насычанасці карціна стаіць вышэй «Вясёлых рэбят». Добра гучыць музыка кампазітара Дунаеўскага і песня аб радзіме, якая выконваецца ў карціне, безумоўна стане адной з любімых песень нашай моладзі.

У фільме нямала дасціпных сцэн, якія прымушаюць глядача весела смяяцца. Ён смяецца і горача апладыруе карціне, а гэта самая лепшая атэстацыя для яе.

М. НОВІЧ.

МЕНСКІЯ ГАРАДСКІЯ ЛЕГКААТЛЕТЫЧНЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ

31 мая ў Менску скончыліся першыя ў гэтым сезоне гарадскія лёгкаатлетычныя спаборніцтвы. Асобныя маладыя спартсмены ўжо ў пачатку сезона паказалі высокія рэзультаты. Чырвонаармеец тав. Дуровіч прыгнуў з разбегу ў вышыню на 175 сант. Бліскуча прыгнуў з шастом чырвонаармеец тав. Нікіфараў. Спартакаўка Гросберг прабегла 60 метраў за 8,8 секунды, яна-ж заняла першае месца ў прыжках у даўжыню з месца. Лепш за ўсіх мятнуў дыск дынамавец Іаварын — 33 метры 91 сантыметр.

Аднак, спаборніцтвы поўнасцю сябе не апраўдалі, бо ў іх прымала ўдзел толькі 30 чал. Лепшыя лёгкаатлеты горада—чэмпіёны рэспублікі — тт. Дароўскі, Сокалаў, Гетманец, Міхалькова, Ліпніцкі, Вайкоў і інш. не рашыліся аспрэчваць асабістае пярэшынства, баючыся, відавочна, прайграць маладым спартсменам. Між тым гэтыя майстры трэніраваліся ў гэтым годзе на поўдні, на што ВСФК БССР патраціў шмат сродкаў.

ЗДАРЭННІ

* **«Вярбоўшчык».** 7 сакавіка аддзел кадраў УСРР прыняў на работу ў якасці сакратара І. М. Дзержановіча. Праз месяц новага, яшчэ неправеранага, работніка накіравалі ў камандзіроўку — вербаваць рабочую сілу ў Брагінскім раёне. Хутка Дзержановіч пісьмова паведаміў, што вярбоўка праходзіць добра, а яму патрабны грошы. 14 красавіка Дзержановіч па тэлеграфу перавялі 1.000 руб., а яшчэ праз 6 дзён— 1.200 рублёў.

Атрымаўшы грошы, Дзержановіч пакінуў Брагінскі раён і прыехаў у Менск п'янствавать. На работу ён больш не з'явіўся. Знойдзен ён быў аператыўнымі работнікамі Крымінальнага вышуку на чардаку дома № 46 па Совецкай вуліцы, дзе хаваўся разам са сваім сабутыльнікам Мажначом. Апошні быў раней асуджан на тры гады зняволення ў папраўча-працоўных лагерах, як сопыяльна шкодны элемент.

Дзержановіч прыцягваецца да судовай адказнасці.

ПАВЕДАМЛЕННІ

— 2 чэрвеня, у 7 гадзін вечара, у памяшканні райпартгабінета Кагановіцкага РК КП(б)Б (Дом урада, левае крыло, 5 паверх, пакой 501) адбудзецца семінар прапагандыстаў па гісторыі ВКП(б) совецкіх устаноў.

Тэма: «Ленінізм — ёсць марксізм эпохі імперыялізма і пролетарскай рэвалюцыі».

Семінар праводзіць дырэктар ВПШ т. Мельцер.

— 3 чэрвеня, у 10 гадзін раніцы, у памяшканні райпартгабінета Кагановіцкага РК КП(б)Б (Дом урада, левае крыло, 5 паверх, пакой № 501) адбудзецца чарговы семінар сакратароў парткомаў Кагановіцкага РК КП(б)Б па ленінізму.

Тэма: практ лекцыі прафесара Леніна «Ленінізм — ёсць марксізм эпохі імперыялізма і пролетарскай рэвалюцыі».

Адказны рэдактар Н. СТЭРНІН.

ХАВАЦЬ ГРОШЫ ў ашчадкасах ВЫГОДНА і ЗРУЧНА!

Беларускі трэст Галоўхлеб НКХарчпрома СССР

Вы толькі паспытайце (смачнейшая здобы!)— і хлеб барадзінскі Вам будзе ў спадобу.

ХЛЕБ БАРАДЗІНСКІ ПАТРАБУЙЦЕ ВА ЎСІХ МАГАЗІНАХ МЕНХАРЧГАНДЛЯ І Ў МАГАЗІНЕ ГАЛОЎХЛЕБА (рог Свярдлоўскай і К. Маркса).

Кошт кілограма 2 руб. 10 кап.

ХЛЕБ БАРАДЗІНСКІ ПРЫЕМНАГА ПАХУ І СМАКУ.

ГАЛОЎХЛЕБ.

МЕНСКІ МАЛОЧНЫ КАМБІНАТ

ПРАДАЕ ў любой колькасці ўсім гандлюючым арганізацыям, сталовым, буфетам, рэстаранам

малако, кефір, сыраквашу, тварог, марожанае і іншыя малочныя прадукты.

КУПЛЯЙЦЕ малочныя прадукты вытворчасці менскага молакамбіната.

Адрас камбіната: Масковская 22, тэл. 22-303.

Памяшканне Беларускага дзяржаўнага тэатра імя МЕЙЕРХОЛЬДА

2 чэрвеня

А. Грыбаедаў

„Горе уму"

Пачатак у 8 г. вечара.

Білеты прадаюцца ў касе тэатра з 12 да 2 і з 5 да 8 г. вечара. Хто спозніцца, у глядзельную залу дапушчан не будзе.

Гастролі дзяржаўнага тэатра імя Горкага

«Чырвоная горка» — Я ВЯРНУСЯ

«Пролетарый» — ЦЫРК

«Інтэрнацыянал» — КАНДУІТ

Кіно «СПАРТАК» — Ад 2 чэрвеня

2-я серыя 2-я серыя

МІС-МЕНД

Драма ў 7 частках

У праграме кінохроніка.

Штодзенна 4 сеансы. Каса з 4 г. дня.

Дзіцячы гукавы кінотэатр — КАНДУІТ

У аддзел аб'яў званіце па тэл. 21-845

Народны камісарыят асветы БССР прымае ЗАЯВЫ ад настаўнікаў,

якія па розных прычынах пакінулі работу ў школе або скончылі педагагічныя установы і не працавалі ў школе, а зараз жадаюць вярнуцца на педагагічную работу.

Да заявы трэба прыкласці наступныя дакументы: аб асвеце, працоўны спіс або даведкі, яго замяняючыя, і характарыстыку з апошняга месца работы.

Заявы з дакументамі дасылаць НКАсветы БССР (Менск, Дом урада, пакой 555).

Прыём заяў да 15 чэрвеня 1936 г.

Для настаўнікаў, якім неабходна павысіць сваю кваліфікацыю, будуць арганізаваны кароткатэрміновыя педкурсы (ліпень-жнівень месяцы).

Асобы, прызнаныя годнымі для педагагічнай работы, будуць накіраваны ў школу з новага 1936—37 навучальнага года.

НАРКОМАСВЕТЫ.

БЕЛАРУСКІ ЛЕСАТЭХНІЧНЫ ІНСТЫТУТ імя С. М. Кірава абвяшчае АСЕННІ НАБОР студэнтаў

на 1 курс факультэта механізацыі лесараспрацовак і транспарту лесу, механічнай апрацоўкі драўніны і лесаводчы.

У інстытут прымаюцца асобы, маючыя поўную сярэднюю асвету (10-годка, рабфак, тэхнікум) ва ўзросце ад 16 да 35 год.

Паступаючыя ў інстытут праходзяць прыёмныя іспыты ў аб'ёме поўнай сярэдняй школы па праграмах, зацверджаных КВТА пры СНК СССР, па матэматыцы, беларускай мове і літаратуры (пісьмовыя і вусныя), фізіцы, хіміі і палітграмаце (вусныя).

Да заяў неабходна прыкласці наступныя дакументы:

1) атэстат аб скончанні сярэдняй навучальнай установы;
2) пашпарт (прадстаўляецца асабіста);
3) пасведчанне дзяржаўнай лекавай установы аб становішчы здароўя;
4) дзве фотакарткі з подпісам, засведчаным дзяржаўнай установай і
5) аўтабіяграфію.

Заявы прымаюцца з 1 чэрвеня па 1 жніўня 1936 г. Прыёмныя іспыты з 1 па 20 жніўня.

Прынятыя ў інстытут забяспечваюцца інтэрнатам і стыпендыяй, згодна існуючых законапалажэнняў, па паспяховасці.

Заявы накіроўваць на імя дырэктара інстытута па адрасу: г. Гомель, Совецкая, 48.

(Да заявы неабходна прыкласці паштовых марак на 50 кап.).

ДЫРЭКТАР ІНСТЫТУТА КАРГ.

ВЫД-ВА „МОЛОДАЯ ГВАРДЫЯ" КОГИЗ

Прадаўжаецца падпіска на другое паўгоддзе на ШТОМЕСЯЧНЫ ЖУРНАЛ „ВОЖАТЫЙ"

Орган ЦК ВЛКСМ

Журнал „ВОЖАТЫЙ" — кіруючы журнал для важатых атрадаў юных піонераў. Выходзіць пры ўдзеле кваліфікаваных педагогаў, лепшых важатых.

Журнал „ВОЖАТЫЙ" — дапамагае правільна будаваць выхаваўчую работу ў піонерскім атрадзе, перадае вопыт лепшых важатых, узбройвае піонерскага работніка неабходнымі практычнымі навыкамі і ведамі ў розных галінах работы з дзецьмі (абарончая работа фізкультура, тэхніка і т. п.). Журнал друкуе лепшыя ігры, песні, дае рэкамендацельныя спісы літаратуры.

Падпісная цана: на год — 6 руб. | на 6 мес. — 3 рублі. | Кошт асобнага нумара 50 кап.

Падпіска прымаецца ўсімі аддзяленнямі, магазінамі, кіёскамі і, упаўнаважанымі КОГИЗа ў галоўнай канторы КОГИЗа (Масква, Марасейка 7) і ўсюды на месцах.

ПАСТАНОВА № 18

ПРЭЗІДЫУМА МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА АД 31 МАЯ 1936 г.

Аб правядзенні летняга ўчоту жывёлы, пасеваў і садоў.

У адпаведнасці з пастановай СНК БССР ад 18 мая 1936 г. «Аб правядзенні летняга ўчоту гаспадарак і жывёлы» Менскі гарадскі совет ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Даручыць горінспектуры наргасучоту пры Менгорсовеце правесці па гор. Менску ў перыяд з 1 па 10 чэрвеня 1936 г. учот прадукцыйнай і рабочай жывёлы, пасеваў і садоў ва ўсіх дзяржаўных, кааперацыйных, грамадскіх установах і арганізацыях, прамысловых, гандлёвых і транспартных прадпрыемствах, загатоўчых і адкормачных пунктах, на базах прадубойнага ўтрымання пры бойнях і мясакамбінатах па становішчы на 1 чэрвеня 1936 г., а па прыватнаўласніцкіх гаспадарках на момант апросу з аглядам жывёлы ў натуры.

Учоту падлягаюць коні, буйная рагатая жывёла, авечкі, козы і свінні.

2. Абавязаць кіраўнікоў гаспадарак прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый пералічаных у п. 1-м, маючых прадукцыйную ці рабочую жывёлу, вылучыць асоб, адказных за правядзенне гэтай работы і выслаць іх у горсовет (інспектура наргасучоту) за атрыманнем фармуляраў і інструктажу аб парадку правядзення ўчоту не пазней 5 чэрвеня 1936 г.

Вынікі ўчоту павінны быць праверены асабіста кіраўнікамі устаноў і прадпрыемстваў і прадстаўлены горінспектуры наргасучоту не пазней 8 чэрвеня 1936 г.

3. Прапанаваць кіраўнікам устаноў і арганізацый пад іх асабістую адказнасць выдзеліць на час учотнай кампаніі праверэных і тэхнічна падрыхтаваных работнікаў у распараджэнне горінспектуры наргасучоту з захаваннем за імі іх зарплаты.

4. Даручыць інспектуры наргасучоту правесці інструкцыйную нараду з вылучанымі работнікамі прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый 2 чэрвеня 1936 г.

5. Па скончэнні ўчоту правесці праз спецыяльныя праверачныя брыгады кантрольныя абходы, ахапіўшы не менш 15—20 проц. ад усёй колькасці гаспадарак, маючых жывёлу.

6. Устанавіць, што асобы, вінаватыя ва ўтойванні ад дзяржаўнага ўчоту жывёлы, пасеваў і садоў, а таксама асобы, вінаватыя ў дрэнным правядзенні ўчотных работ, якое прывяло да няўчоту, прыцягваюцца да крымінальнай адказнасці.

7. Даручыць інспектару наргасучоту вынікі ўчоту далажыць прэзідыуму горсовета 19 чэрвеня 1936 г.

Старшыня Менскага Горсовета ЖУКОВІЧ.

Сакратар Горсовета КАЗЛОЎСКІ.

Менскі аўтадарожны тэхнікум

Упосдора НКУС БССР

абвяшчае ПРЫЁМ

на 1 курс тэхнікума на 1936—37 навуч. год.

Тэхнікум рыхтуе тэхнікаў па будаўніцтву дарог і мастоў. Тэрмін навучання — 3 гады 9 мес.

У тэхнікум прымаюцца грамадзяне ва ўзросце ад 16 да 35 год, асвета якіх у аб'ёме няпоўнай сярэдняй школы (7 класаў).

Усе паступаючыя ў тэхнікум трымаюць іспыты ў аб'ёме НСШ па беларускай і рускай мовах, матэматыцы (пісьмовыя і вусныя), па фізіцы, хіміі і палітграмаце (вусныя).

Стыпендыя па паспяховасці. Іншагародняя забяспечваюцца інтэрнатам і пасцельнымі прыладамі. Пры тэхнікуме ёсць сталовая.

Прыём заяў да 1 жніўня.

Да заявы неабходна прыкласці: аўтабіяграфію, атэстат аб скончанні няпоўнай сярэдняй школы (у арыгінале), пасведчанне лекавай установы аб тым, што паступаючы не мае хвароб, перашкаджаючых паступленню, 2 фотакарткі з уласнаручным подпісам на іх паступаючага, заверэны дзяржустановай, метрыку і на 40 кап. паштовых марак.

(Пашпарт прад'яўляецца паступаючым асабіста).

Заявы і дакументы дасылаць: г. Менск, Барысаўскі тракт, 71-а. Дырэктару аўтадарожнага тэхнікума.

Прыёмныя іспыты з 1 жніўня. Кожнаму дапушчанаму да іспытаў аб часе прыезду на іх будзе паведамлена поштай. У час іспытаў будуць арганізаваны кансультацыі для паступаючых.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Тыраж 90550 экз. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 81. Уп. Галоўлітбела № К—97.